РАДЫЕ У ГАДЗ. НОЧЫ:

ЗЬВЯЗДА

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

№ 166 (3274) Серада, 24-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

Арышт карэйскага рэвалюцыянэра

ШАНХАЙ, 23. Японская консульская паліцыя арыштавала карэйскага рэвалюцыянэра Рыо-Хундзіо, які прыехаў у Шанхай з Нагасакі.

Апошнія навіны Б. С. С. Р.

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Зараз на пабудове завода с.-г. машын пачалося будаўніцтва піцейнага цэху. Рад карпусоў учарне гатовы.

Гэтымі днямі з будаўніцтвам знаёміўся старшыня камітэту будаўніцтва пры эканомнарадзе, які прызнаў якасьць работ здавальняючай.

Памятуй аб восені

Падрыхтоўка да васеньняй пасеўнай кампаніі, ня гледзячы на іншыя адказныя і важныя задачы, якія ў даны момант стаяць перад намі, павінна быць пастаўлена ў цэнтры нашае ўвагі і клопатаў.

Пытаньні ўзьняцьця сельскае гаспадаркі яшчэ доўгі час будуць стаяць, як адны з першачарговых пытаньняў усёй нашай работы.

Ступень нашае ўвагі да гэтых важнейшых пытаньняў правяраецца звычайна вынікамі пасеўных кампаній.

Кампанія веснавой сяўбы бягучага году па Беларусі паказала, што памечаныя пляны не па ўсіх паказальніках выкананы поўнасьцю. Прычынамі такога становішча зьяўляюцца амаль выключна недахваты падрыхтоўчай работы. Ні аб якіх «аб'ектыўных» прычынах тут ня можа быць і гутаркі. Правыя апартуністыя жорстка пабіты са сваёй тэорыяй «дэградацыі» сельскае гаспадаркі (гл., напрыклад, у сёньняшнім нумары артыкул т. Я. Пайкіна «Аб «дэградацыі» сельскае гаспадаркі).

Тыя недахопы, якія ў нас у гэтых адносінах ёсьць, тлумачацца выключна рознымі тэхнічнымі, арганізацыйнымі і інш. памылкамі і промахамі нашых адпаведных органаў і апаратаў.

Вось чаму да такое важнае справы, як пасеўная кампанія, трэба рыхтаваца не насьпех, калі на носе самая сяўба, а далёка загадзя, правільней—увесь час.

На жаль, тыя паасобныя весткі з гэтага вучастку, якія мы ў даны момант маем, гавораць нам аб тым, што ня ўсюды падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ідзе досыць здавальняюча. Сёньня мы, напрыклад, паведамляем аб пагрозе, што навісла над справай вапнаваньня. Дзякуючы цэламу раду няўвязак і непаладак у рабоце нашых апаратаў, такое важнае для посьпеху пасеўнай кампаніі мерапрыемства, як вапнаваньне глебы, тармозіцца і пагражае сарваца прынамсі для азімых бягучага году.

Учора наша газэта паведамляла аб зусім немагчымым становішчы з забясьпечанасьцю агранэрсаналам цэлае акругі (Мазырскае). Думаецца, што гэта зьявішча ў тэй або іншай ступені можна спаткаць і ў іншых акругах.

Ёсьць весткі і аб паасобных фактах слабай падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы з боку камітэтаў узаемадапамогі і с.-г. каапэрацыйных аб'яднаньняў, галоўным чынам па лініі аказаньня належнай дапамогі вясковай беднаце, г. зн. у адносінах якраз аспоўнага зьместу работы гэтых арганізацый. Ачыстка насеньня і пратручваньне яго—аспоўныя ўмовы посьпеху кампаніі, толькі ў тым выпадку дадуць патрэбныя вынікі, калі сваячасова вакол гэтае справы будзе мабілізавана ўся ўвага вёскі. А між тым, вядома, што ня ўсюды яшчэ прыступлена да арганізацыі пунктаў па ачыстцы насеньня. Між тым, задача заключаецца ў тым, каб у кароткі тэрмін паміж абмалотам ураджаю і сяўбой пасьпець ачысьціць пасеўнае збожжа.

Няма чаго і гаварыць, што ўсе гэтыя недахопы, ня будучы зьнішчанымі, зараз-жа выявяцца на посьпеху правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі.

Усе гэтыя недахопы яшчэ могуць быць выпраўлены пры ўмове:

Ні на хвіліну не забываць аб надыходзячай сяўбе.

Апошнія маскоўскія навіны

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Папярэдняя падпіска на III пазыку

Першыя мільёны

Паводле папярэдніх даных, датэрміновая стыхійная падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі дала ў Маскве ўжо тры з паловаю мільёны рублёў. Тры чвэрткі гэтай сумы далі рабочыя буйных прадпрыемстваў.

ПАЧЫНАЕЦЦА ТРАНСАКІЯНСКІ ПЕРАЛЕТ

У мора выходзіць савецкая плывучая база

1-га жніўня пачынаецца вялікі савецкі трансакіянскі пералёт. Самалёт «Краіна Саветаў» пад кіраўніцтвам тав. Шастакова вылятае з Масквы ў Нью-Ёрк. У бліжэйшыя дні з Уладзівастоку да Алеуцкіх выспаў выходзіць плывучая база самалёт—судно «Чырвоны вымпел».

«Чырвоны вымпел» будзе забясьпечваць самалёт у дарозе гаручым і рабіць іншую дапамогу. Праз сваю радыё-станцыю судно будзе трымаць непарыўную сувязь з т. Шастаковым.

Баявая трывога

„На кітайскую граніцу"

У ноч з 20 на 21 ліпеня ў Маскоўскай арганізацыі камсамолу была зроблена баявая трывога-мабілізацыя. Трывога дала дасканалыя вынікі. Камсамольцы былі пераконаны, што будуць адпраўлены на кітайскую граніцу. Настрой быў баявы. Неявак зусім ня было. Таварышы разьвітваліся з сем'ямі, пераконаныя, што ідуць на фронт. Лісты, пасланыя імі дадому пацьвярджаюць поўную баявую гатоўнасьць прыняць выклік імпэрыялістых і перамагчы. Праверка [illegible] рухомасьць, арганізаванасьць і баявую гатоўнасьць камсамольскіх ячэек.

БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ ВАЕННАЙ НЕБЯСЬПЕКІ

Сусьветны пралетарыят—на абарону СССР

II кангрэс антыімпэрыялістычнай лігі

Даклад тав. Гары Політ

БЭРЛІН, 22. Сёняшняе ранішняе пасяджэньне кангрэсу антыімпэрыялісцкае лігі было прысьвечана прывітальным прамовам. Найбольш урачысты момант ранішняга пасяджэньня супаў з перадачаю прэзыдыуму сьцягу ПАЗШ, які быў захоплен войскам Сандыно ў 1928 годзе. Сьцяг быў перададзены генэральным сакратаром камітэту «Рукі прэч ад Нікарагаў» Хурвіцам. Адімя прэзыдыуму ўрачыста прыняў сьцяг Мэкстэн.

Апошняе прывітальнае слова сказаў Саклатвала ад імя ўсіх пралетарскіх дэлегатаў Індыі, якія не змаглі прысутнічаць на кангрэсе, бо знаходзяцца ў зьняволеньні. Саклатвала падкрэсьлівае, што ў індыйскім анты-імпэрыялістычным руху ёсьць дзьве плыні, а іменна—нацыянальна-рэвалюцыйная і пралетарска-рэвалюцыйная. Саклатвала далей падкрэсьлівае, што левае крыло рабочае партыі ў сапраўднасьці нагадвае сабою вартаўнікоў рабочае партыі зьлева». Саклатвала нападае на Мэкстона за яго непасьлядоўнасьць у барацьбе супроць ангельскага імпэрыялізму».

Мэкстон зараз-жа выступае з адказам, абараняе сябе ад папрокаў і спасылаецца на апошні зьезд незалежнай рабочай партыі.

На дзённым пасяджэньні будзе зроблены цэнтральны даклад аб палітычным становішчы і задачах Лігі. Дакладчык—Гары Політ.

* ** *

ФРАНКФУРТ НА МАЙНЕ, 23. На вячэрнім пасяджэньні кангрэсу лігі барацьбы супроць імпэрыялізму і прыгнечаньня калёніяльных народаў выступіў з дакладам Гары Політ. У буржуазным рэакцыйным руху розных калёніяльных краін,—сказаў Політ,—можна адзначыць дзьве плыні. Правую, якая ўжо капітулявала перад імпэрыялістымі або знаходзіцца на шляху да капітуляцыі і левая, якая ня хоча працаваць сярод рабочых мас. Політ рэзка выкрыў палітыку ангельскае незалежнае рабочае партыі, якая абмяжоўваецца слабой крытыкай ураду Макдональда, але ня хоча галасаваць супроць яго і тым самым прымае на сябе адказнасьць за яго ўчынкі. Ліга—заявіў ён—павінна прыняць усюды чынны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні дня 1-га жніўня.

Генэральны анты-ваенны камітэт у Хэмніцы

БЭРЛІН, 22. У Хэмніцы адбыўся ўстаноўчы сход па арганізацыі антываеннага камітэту. На сходзе прысутнічала 78 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 62 тысячы рабочых. Утвораны генэральны антываенны камітэт для Хэмніца і ваколіц. Прынята адозва, якая заклікае рабочых 1-га жніўня спыніць работу на гадзіну да нарманьнага тэрміну і прыняць удзел у дэманстрацыях супроць небясьпекі вайны і за абарону Савецкага Саюзу.

Рабоча-сялянскі зьезд парыскага раёну

На зьезд прыбыло 500 дэлегатаў

ПАРЫЖ. 22-га ліпеня адкрыўся 1-шы рабоча-сялянскі зьезд парыскага раёну. Адкрыцьце адбылося ў некалькі незвычайных абставінах, таму, што ўчора Урад ужыў рад новых мер, накіраваных супроць камуністычнае партыі і рабочага руху. Напярэдадні зьезду, міністар унутраных спраў Тард'е забараніў камуністычнаму мэру Клішы прадаставіць залю мэрыі для правядзеньня ў ёй зьезду. Рабочы муніцыпалітэт Клішы ня выканаў гэтага распараджэньня. Атрады паліцыі акружылі мэрыю і запялі суседнія вуліцы, не прапушчаючы на зьезд рабочых дэлегатаў. Дэлегаты накіраваліся ў Сант-Уран, дзе, ня гледзячы на ўрадавую забарону, у залі рабочага капэратыву адкрыўся зьезд. На зьезьдзе прысутнічае 500 дэлегатаў, у тым ліку прадстаўнікі ад рабочых буйных прадпрыемстваў, кампартыі, камсамолу і іншых.

З дакладам па пытаньні аб дні 1-га жніўня выступіў тав. Дорыё, які падкрэсьліў блізкую небясьпеку вайны на Далёкім Усходзе і папярэджваў рабочых супроць манэўраў імпэрыялістычных дзяржаў. Дорыё падкрэсьліў необходнасьць утварэньня камітэту па правядзеньні дня 1-га жніўня.

Зьезд прыняў маніфэст, у якім вітае лёзунгі кампартыі і заклікае ўсіх працоўных выступіць 1-га жніўня супроць вайны, што рыхтуецца супроць СССР, які зьяўляецца бацькаўшчынаю эксплёатуемых усяго сьвету.

Скандынаўска-фінскі антыімпэрыялістычны кангрэс

Швэдзкія і нарвэскія салдаты будуць абараняць СССР

ГЕТЭБОРГ, 22. У Гетэборгу (Швэцыя) адбыўся скандынаўска-фінскі кангрэс па барацьбе з небясьпекаю вайны пры ўдзеле 170 дэлегатаў.

Зьяўленьне на трыбуне прадстаўніка нямецкае кампартыі, які вітаў кангрэс і расказаў аб першамайскай барацьбе бэрлінскага пралетарыяту, было спаткана гучнымі воплескамі ўсяго кангрэсу. Дакладчык па пытаньні аб барацьбе з небясьпекаю вайны Лангхет (член ЦК кампартыі Нарвэгіі) падкрэсьліў у сваім дакладзе тую актыўную ролю, якую адыгрывае швэдзкая буржуазія ў больш-тыцкім антысавецкім блёку. У вайне з СССР прымае ўдзел і Нарвэгія з яе морскім транспартам і вельмі разьвітай хэмічнай прамысловасьцю.

Такім чынам Бальтыцкае мора абарочваецца ў пляцдарм для антысавецкае вайны. Азіяцкаму і бальтыцкаму антысавецкаму блёку павінен быць супроцьпастаўлен скандынаўска-бальтыцкі блёк пралетарыяту. **У выпадку нападу імпэрыялістых на СССР, пралетарыят уздыме сьцяг грамадзянскае вайны,**—заканчвае свой даклад т. Бланштэт.

У дакладзе аб міжнародным чырвоным дні выступіў тав. Арвіс Гарсон, які перш за ўсё зазначыў, што за сьпіною кітайскае рэакцыі, што захапіла Кіт.-Усх. чыгунку, знаходзіцца сусьветная буржуазія. У гэтай абстаноўцы міжнародны чырвоны дзень набывае асабліва важнае значэньне, як выступленьне сусьветнага пралетарыяту ў абарону СССР.

У цеснай сувязі з дакладам аб ваеннай небясьпецы стаяў даклад Ольсэна аб разбойніцкай дзейнасьці рэфармістых. **Супольная работа сац.-дэмакратаў з буржуазія даходзіць да таго, што ў час канфлікту ў нарвэскай хэмічнай прамысловасьці рэфармісцкія лідэры прафсаюзу разам з дырэктарамі хэмічнага трасту выступалі супроць патрабаваньняў рабочых.** Палітыцы рэфармістых,—заявіў Ольсэн,—рабочыя даюць адпор і зараз звыш 500 швэдзкіх прафарганізацый, якія яднаюць звыш 100 тысяч рабочых, выказаліся за падтрыманьне камітэту прафсаюзнага адзінства.

Гучнымі воплескамі і сьпевам «Інтэрнацыяналу» сустрэў кангрэс зьяўленьне на трыбуне групы швэдзкіх і нарвэскіх салдат. У бадзёрай юнацкай прамове нарвэскі камсамолец у вайсковым адзеньні далажыў кангрэсу аб посьпехах анты-мілітарыстычнай работы нарвэскае армії. У вайсковых часьцях падрабязна абгаворвалася пытаньне аб антысавецкай правакацыі з боку кітайскае рэакцыі і нарвэскія салдаты выносілі рэзалюцыі аб абароне СССР.

Кангрэс ад імя 150 тысяч прадстаўленых на ім рабочых паслаў тэлеграму кітайскаму пасольству ў Стакгольме з рэзкім пратэстам супроць антысавецкай правакацыі кітайскага контр-рэвалюцыйнага ўраду.

Далей кангрэс прыняў маніфэст аб ваеннай небясьпецы, у якім заклікае скандынаўскіх і бальтыцкіх рабочых да клясавых выступленьняў у дзень 1-га жніўня і прапануе ім дэманстраваць сваю баявую гатоўнасьць да абароны СССР.

Кангрэс заснаваў скандынаўска-фінскі камітэт па барацьбе з ваеннай небясьпекаю. Закончыўся кангрэс прамоваю нямецкага камуністага Молара, заклік якога да абароны СССР быў спатканы шматлікімі «ура» і пяньнем «Інтэрнацыяналу».

Швэдзкая буржуазія патрабуе рэпрэсій

СТОКГОЛЬМ, 22. У сувязі з падрыхтоўкаю да чырвонага дня, швэдзкі буржуазны друк патрабуе паліцэйскіх рэпрэсій супроць камуністычнае партыі з мэтаю перашкодзіць арганізацыі дэманстрацый. Камэнтуючы сход салдат у Стокгольме, якія выказалі сваю салідарнасьць з СССР, і з Чырвонай арміяй і заявілі аб сваёй гатоўнасьці да барацьбы супроць імпэрыялістычнае вайны «Афтонбладэт» патрабуе рэпрэсій супроць камуністых, якія вядуць антываенную «здрадніцкую» прапаганду.

Немецкія матросы адмовіліся везьці ўзбраеньне для Чан Кай-шы

БЭРЛІН, 23. «Ротэ Фанэ» паведамляе з Данцыгу, што 19 ліпеня з польскае гавані Гдыні вышаў у Шанхай параход «Фальке» умяшчальнасьцю ў 9.000 тон з вялікім грузам вайсковае амуніцыі. Матросы параходу «Фальке», які зьяўляецца гамбургскім параходам, адмовіліся перавозіць транспарт для Чан Кай-шы у Шанхай, пакінулі ўсе разам параход і ўзялі разьлік. Капітан параходу хацеў набраць новых матросаў у Данцыгу, але матросы ўсюды заяўлялі, што яны падтрымліваюць пралетарскую салідарнасьць з СССР і ні ў якай меры ня думаюць нават дапамагаць узбройвацца сьмяротнаму ворагу Савецкага Саюзу. У выніку капітан не знайшоў іншага выхаду, як навербаваць польскі экіпаж, з якім ён у пятніцу і адплыў з Гдыні.

БАЯВЫ ПАРЫЎ

Адказ гэройскай Самарскай кавдывізіі кітайскім белабандытам

У лягеры 15-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі на адкрытай лягернай сцэне, адбыўся мітынг усіх часьцей лягернага збору. Няма слоў апісаць баявы парыў і абурэньне. Гэта было нешта нязвычайнае. Адчувалася ў гэтым баявым запале магутная непераможная сіла, якой няма меж. На загарэлых тварах байцоў «самарцаў» гарэла адно агульнае жаданьне—гэта зьвярнуць галаву бандыту Чан Кай-шы, у прыклад другім.

Байцы і начсклад, усьведамляючы свой абавязак перад працоўнымі СССР і ўсяго сьвету заяўляюць, што яны ў баявой гатоўнасьці і па першым заклику партыі ўсе як адзін гатовы несьці з сабою сьмерць усім ворагам пралетарскай рэвалюцыі.

Байцы не абмежаваліся толькі абурэньнем. Па прапанове чырвонаармейца №-га кавпалка т. Прохарава, які першы ўнёс рубель, быў адкрыты збор на пабудову самалёту «Наш адказ бандыту Чан Кай-шы». Прапанова т. Прохарава была пакрыта доўгімі воплескамі. У часе збору сродкаў прэзыдыум абярнуўся нібы ў штаб па збору, а маса—ў суцэльную чаргу. Чарга цягнулася звыш трох гадзін.

Спачатку выклікалі байцы адзін другога, потым пачалі выклікаць калектыўна па ўзводах, эскадронах, палках і нарэшце выклікалі Чангарскую Кавдывізію, №-ую Беларускую стралковую дывізію, АБВШ імя ЦВК БССР. Здача грошай і выклікі рабіліся тут-жа. ПЛЕВАКА—камандзір узводу, гэрой ордэну чырвонага сьцягу ўнёс 25 руб., ПЕЧАРАЎ—камандзір узводу—срэбную табакерку, якую ён атрымаў у дзень дзесяцігодзьдзя дывізіі, ШЭЛЕХ—камузводу — 45 рублёў, каваль запасу ЯНЧОНАК за сябе і за жонку—20 руб.

Была прапанова здаваць на калектыўнае захаваньне аблігацыі і зусім стыхійна, замест захаваньня, аблігацыі пачалі здаваць на пабудову самалёту. Першыя пачалі здаваць байцы па 5 і па 10 рублёў, а потым здаваў і начсклад. Усяго аблігацыямі сабрана каля 500 руб. Потым пачалі папярэдня падпісавацца за 3-ю пазыку індустрыялізацыі: КУБРЫНСКІ—камандзір узводу на 25 руб., ЖУКАЎ, камандзір палка на 150 руб., ВЯЛІКАБРЫЦКІ, бюро калектыву УсеКП(б) палка—на 200 руб. і начпадыў т. БАЧАРОЎ унёс 50 руб. на пабудову самалёту і 200 руб. 3-й пазыкі індустрыялізацыі і выклікае камандзіра дывізіі т. ДМІТРЫЕНКА, Камдыва і Начпадыва Чангарскай, камдыва і начпадыва №-й беларускай стр. дывізіі, начальніка і яго памочніка АБВШ, камандзіра т. ЦІМАШЭНКА, яго памочніка т. КРОХМАЛЯ.

Прынята таксама прапанова выклікаць сутаварыскія арганізацыі 7-й дывізіі—КАМСАМОЛ г. МЕНСКУ, шэфаў палкоў іншых гарадоў, Астрахань, Самару, Церскую вобласьць і Стаўропаль.

Не пасьпелі прагаласаваць гэтую прапанову, як пад бурныя воплескі прымаецца прапанова выклікаць т. т. ВАРАШЫЛАВА, УНШЛІХТА, БУБНОВА, БУДЗЁННАГА І РВС АКРУГІ (беларускай), РВС СССР.

Пастанавілі прэзыдыум мітынгу пераіменаваць у штаб збору, выпучыць тройкі ў палках, пусьціць падпісныя лісты і прасіць камандаваньне дывізіі выпучыць аднаго камандзіра ў школу лётнікаў з тым, каб ён хутчэй змог кіраваць гэтым самалётам. Усяго на працягу мітынгу сабрана каля 1.000 рублёў.

Вось як адказалі байцы і начсклад №-й самарскай на замахі кітайскіх наймітаў на нашы правы.

Байцы і начсклад са здавальненьнем аднадушна ўхвалілі сур'ёзныя меры Савецкага ўраду—спыненьне дыпляматычных зносін і запэўняюць урад, што яны кожную хвіліну гатовы даць адпор ворагу і абяцаюць яшчэ больш напружана ўздымаць баявую падрыхтоўку шляхам сацыялістычнага спаборніцтва.

Член штабу па збору сродкаў на самалёт «Наш адказ бандыту Чан Кай-шы», адказны сакратар бюро калектыву УсеКП(б) №-га палка І. АЛЕЙЧЫК.

Працоўнае сялянства БССР будуе самалёт „Сялянская ўзаемадапамога Беларусі"

2-гі пашыраны пленум Цэнтральнага Камітэту сялянскага таварыства ўзаемадапамогі Беларусі ад імя 2-х мільёнаў сваіх членаў—працоўнага сялянства Савецкай Беларусі выносіць свой рашучы пратэст і з абурэньнем заяўляе:

Захоп Кіт.-Усх. чыгункі зьяўляецца чарговай правакацыяй імпэрыялістых з мэтай ускладненьня СССР у вайну.

Пленум поўнасьцю ўхваляе, як першую, так і другую ноту ўраду Кітаю.

Двухмільённае працоўнае беларускае сялянства заяўляе: **даволі цярпець зьдзекі міжнародных імпэрыялістых. Не дазволім злоўжываць мірнай палітыкай савецкага ўраду!**

Мы патрабуем ад нашага ўраду прыняцьця тэрміновых і рашучых мер і неадкладна палажыць канец усім зьдзекам над рэспублікай працы.

У знак пратэсту і для ўзьняцьця яшчэ большай абароназдольнасьці краіны саветаў, **пленум пастанавіў пабудаваць баявы самалёт «Сялянская ўзаемадапамога Беларусі» і ўносіць першы ўзнос у 1.000 руб.**

Няхай жыве СССР—краіна будаўніцтва сацыялізму!

Няхай жыве моцны сусьветны саюз рабочых і сялян!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Няхай жыве Камінтэрн—баявы штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Бадзёры настрой нямецкага пралетарыяту

кампанія па падрых[illegible] скіх дзён у Нямеччыне [illegible] кожным днём ахоплівае ўсе больш шырокія працоўныя масы. Лёзунгі барацьбы супроць ваеннай небясьпекі зараз надзвычайна папулярныя сярод рабочых Нямеччыны. Нарада рэвалюцыйных фабрычна-заводзкіх камітэтаў буйнейшых прадпрыемстваў цяжкай індустрыі Рурскай краіны—Крупа, Тысэна, заводы ў Бахуме і інш., якая адбылася на днях у Эсэне, —пастанавіла склікаць 11-га жніўня зьезд фабзаўкомаў усёй Рурскай краіны. Перад гэтым усюды пастаноўлена склікаць сходы мясцовых фабзаўкомаў для абраньня дэлегатаў на зьезд. Як на агульных сходах фабзаўкомаў, так і на зьезьдзе галоўнае месца павінны заняць пытаньні аб ваеннай небясьпецы.

Надзвычайна паказальным зьяўляецца пануючы сярод рабочых мас настрой. У Нейсе агульны сход фабзаўкомаў прагнаў старшыню рэфармістага і пастанавіў аднадушна пратэставаць супроць пагрозы імпэрыялістычнай вайны сова сход заклікаў рабочых Нейса і Левэркуза прыняць удзел у антываенных дэманстрацыях 1-4 жніўня.

Арганізацыйнае пасяджэньне прошываеннага камітэту бэрлінскага прадмесьцьця Прэнцлаўэр-Бэрг, з удзелам прадстаўнікоў большасьці мясцовых прадпрыемстваў, КПН і іншых рэвалюцыйных арганізацый, пастанавіла выпусьціць адозву супроць вайны ў колькасьці 20.000 экзэмпляраў.

Такі-ж настрой пануе і ў рабочым спартыўным аб'яднаньні ў Эрфурце, якое выказалася большасьцю ўсіх супроць двух за ўдзел у антываеннай дэманстрацыі 1-га жніўня і заклікае ўсе спартыўныя рабочыя арганізацыі далучыцца да іх.

Паведамленьні аб актыўнай падрыхтоўцы да жніўненьскіх дзён прыходзяць з усіх канцоў краіны. На агульным сходзе рабочых усеагульнай электрычнай кампаніі раёну **Бэрлін-Брунэнштрасэ** абраны камітэт барацьбы супроць ня[illegible] рабочых **ў Кіле** пастаноўлена спыніць 1-га жніўня работы і далучыцца да камуністычнай дэманстрацыі. Такую-ж пастанову ўхвалілі рабочыя буйных хэмічных заводаў **Леуна. З Хэмніца** паступілі весткі аб абраньні раду камітэтаў па барацьбе супроць ваеннай небясьпекі. Такі-ж камітэт створаны і ў **Золінгене,** які ўяўу на сябе арганізацыю антываеннага руху 1-4 жніўня ў Залінгене і Бісдорфе (цэнтры хэмічнай прамысловасьці золінгенскага раёну). Дэлегацыі будаўнічых рабочых буйнейшых фірм **Лейпцыгу** зьвярнуліся да ўсіх лейпцыгскіх рабочых з заклікам выйсьці ў жніўненьскія дні на вуліцу і дэлегаваць сваіх прадстаўнікоў у камітэт барацьбы супроць ваеннай небясьпекі. Фабзаўком буйнай тэкстыльнай фабрыкі **ў Мюнхэн-Гладбаху** большасьцю супроць двух выказаўся за ўваходжаньне ў антываенны камітэт.

А. ВІЛЬ.

Супроць імпэрыялістычных правакатараў

Год таму назад пасьля 6-га кангрэсу Камінтэрну, буржуазія і сацыял-фашысты прабавалі прадставіць справу так, што ніякай небясьпекі вайны няма, што Камінтэрн таму толькі гаворыць пра вайну, што без вайны, бачыце, немагчыма рэвалюцыя.

Але прайшоў толькі год з часу 6-га кангрэсу, і самая імпэрыялістычная сапраўднасьць у вялікай колькасьці падала канкрэтныя довады правільнасьці пастаноў 6-га кангрэсу. Справакаваны імпэрыялістымі напад на савецкае консульства ў Харбіне, наглы захоп Кіт.-Усх. чыгункі, арышты і гвалты над нашымі прадстаўнікамі ў Манчжурыі зьяўляюцца настолькі яўнымі аднакамі вайны, якая рыхтуецца супроць СССР, што нават нашы ворагі ня могуць маўчаць аб гэтай небясьпецы. Шырокія масы працоўных у СССР і за граніцаю поўны трывогі за мірнае існаваньне Савецкага Саюзу. Адгэтуль аднадушныя дэманстрацыі пратэсту супроць імпэрыялістычных правакатараў, адгэтуль магутныя заклікі да абароны СССР.

Імпэрыялістычная буржуазія, распальваючы вялікія і «малыя» войны ва ўсіх куткох зямное кулі і рыхтуючыся кінуць агонь проста ў парахоўніцу, напружвае адначасова ўсе свае сілы для таго, каб дымавою заслоною ілжывых пацыфісцкіх фраз замаскаваць свае ліхаманкавыя рыхтаваньні да вайны. Меркаваньні аб вайне на Далёкім Усходзе, крывадушныя папрокі па адрасу кітайскага ўраду, якія яны-ж самі справакавалі, «добрапажаданыя» заклікі ўмеранасьці па адрасу савецкае ўлады працягваюць **толькі адну мэту—дурманом пацыфізму аглушыць рабочыя масы і паралізаваць іх волю да пратэсту.**

Які-ж сэнс маюць балбатня пра мірнае «умяшэньне» Лігі Нацый і зварот НАЗШ дзяржаўнага сакратара Стымсона з прапановаю пасярэдніцтва? Калі буржуазія старанна прыкрывае свае разбойніцкія пляны пацыфісцкімі фразамі, дык сацыял-фашысты адыгрываюць ролю простых ініцыятараў ва ўсёй чыннасьці буржуазіі і ў сваім цкаваньні СССР дапамагаюць выкрыцьцю імпэрыялістычных выдумак. Нямецкі «Форвэртс» займаецца агідным цкаваньнем савецкага «імпэрыялізму» і замест таго, каб кляйміць сапраўдных віноўнікаў ваеннае небясьпекі на Далёкім Усходзе, нацкоўвае на СССР. **Падзеі на КУЧ,** якія паставілі ўвесь сьвет перад ваеннай небясьпекай, **даюць лепшыя доказы правільнасьці пастаноў 6-га кангрэсу і 10-га пленуму Выканкому Камінтэрну аб неабходнасьці арганізацыі чырвонага дня.**

Але чырвоны дзень ня ёсьць толькі справа барацьбы супроць ваеннае небясьпекі, **1-га жніўня павінна быць баявым агляданым рэвалюцыйных пралетарскіх сіл у сусьветным маштабе.** Пралетарыят у цэлым радзе краін узмоцнена рыхтуецца да чырвонага дня. Чым бліжэй становішча чырвоны дзень, тым больш нэрвовасьці праяўляе буржуазія, тым больш разбэшчанай становішча паліцыя.

Сацыял-дэмакратычны міністр у Нямеччыне Гржэзінскі забараняе інтэрнацыянальныя спатканьні братэрскіх партый у Аахэне. Швэйцарская буржуазія забараніла ўсякія выступленьні на вуліцах і агульных мясцох. Швайцарская «дэмакратыя» таксама забараніла вывешваць 1-га жніўня чырвоны сьцяг, бо ён «зьяўляецца сымбалем рэвалюцыі». Чэха-славацкая буржуазія ўжо задушыла ўвесь камуністычны друк і рэарганізавала ўвесь дзяржаўны апарат супроць рэвалюцыйных рабочых. З асаблівай злосьцю нападае на рэвалюцыйныя арганізацыі напярэдадні 1-га жніўня французкая буржуазія. Газэта «Матэн» адкрыта заклікае да фармальнага скасаваньня «дэмакратычных» грамадзянскіх свабод і свабоды друку, якія фактычна даўно ня існуюць у адносінах кампартыі. Налёты на рэдакцыю «Юманітэ», масавыя арышты рэвалюцыйных рабочых, аблавы на легальныя рабочыя сходы, ліхаманкавая падрыхтоўка да забароны кампартыі, агідненькі працэс па абвінавачаньні ў «шпіёнажы», разгоны,—**усё гэта сьведчыць аб тым, з якой сыстэматычнасьцю наш клясавы вораг «рыхтуецца» да чырвонага дня. Французкія рэфармістыя сумуюць па лаўрах бэрлінскай сацыял-дэмакратыі.**

Трацкістыя ў сваім органе «Фане дэс Комунізм» падтрымліваюць буржуазію і сацыял-фашыстых і заклікаюць «усімі сіламі перашкодзіць антываеннай дэманстрацыі 1-га жніўня». (Фанэ дэс Комунізм» ад 12 ліпеня бягучага году). Клясавая ацэнка, якую дала буржуазія і яе рэфармісцкія і трацкісцкія прыслужнікі дню 1-га жніўня, зьяўляецца лепшай праверкай на практыцы важнасьці і неабходнасьці чырвонага дня. («Правда»).

Стальною сьцяною на абарону СССР

МАСКВА, 22. З Баку паведамляюць, што хваля абурэньня бакінскіх рабочых, выкліканая налётам кітайскіх мілітарыстых на КУЧ шосты дзень не спадае. На прадпрыемствах адбываюцца мітынгі. Прапанова рабочых Бібі-Эйбацкай прамысловай групы аб неадкладным выпуску трэцяе пазыкі індустрыялізацыі знайшла гарачы водгук сярод рабочых усяго прамысловага раёну. Узмацняецца цяга ў ваенныя гурткі. Рабочыя групамі ўступаюць у Асоавіяхім.

У Ленінскім і Сулуханскім раёнах на партыйных сходах атрымліваюць па 30-40 заяў ад горна-рабочых аб прыёме ў партыю. У сувязі з апошнімі нотай савецкага ўраду, колькасьць падаваемых заяў павялічылася. Праводзяцца адлічэньні на пабудову танка. Арганізуюцца суботнікі на абарону краіны.

Аналёгічныя весткі ідуць з Самарканду. На некаторых сходах прыняты пастановы аб стварэньні фондаў для пабудовы паветранай эскадрыльлі «Адказ хунхузам». Такія-ж весткі атрымліваюцца з розных месц Туркменістану. Працоўныя аднадушна заяўляюць аб сваёй гатоўнасьці ў выпадку патрэбы, са зброяй у руках абараняць правы СССР.

З Харкава паведамляюць, што сход працаўнікоў Чырвонаармейскіх газэт украінскае вайсковае акругі—пастанавіў, у адказ на выклік калектыву супрацоўнікаў «Ратаю» і «Звісти» адлічыць аднадзённы заработак на пабудову самалёту «Баявы работнік прэсы Украіны». У Кіеве рабочыя і чырвонаармейцы праводзяць зборы на эскадрыльлю «Наш адказ Чан Кай-шы» і «Рукі прэч ад ССР».

Разгул буржуазнага тэрору ва Францыі

ЗНОЎ МАСАВЫЯ АРЫШТЫ У ПАРЫЖЫ

Парыская паліцыя „за работаю"

ПАРЫЖ, 22. Учора павялічаныя атрады паліцыі, прыехаўшы на 4-х грузавіках і 10 аўтамабілях, акружылі народны дом у Віль-Мэс-Сэн-Жорж, дзе адбыўся прыватны сход кампартыі. Усяго арыштавалі 110 чалавек, у тым ліку сакратара парыскага раёну кампартыі, намесьніка сакратара ЦК і сакратара камсамолу. Сярод арыштаваных таксама 15 жанчын і 4 чужаземных рабочых, якія ў той-жа вечар былі высланы з Францыі. Прэфэктура апублікавала паведамленьне, у якім заяўляе, што «патайны сход меў на мэце падрыхтоўку да чырвонага дня і раздачу інструкцый групам рабочай самаабароны».

ПАРЫЖ, 22. У Буржэ быў зроблен вобыск у памяшканьні рабочае друкарні. Канфіскаваны адозвы, што друкаваліся там да 1-га жніўня.

Пра гляд дакумантаў, захопленых у рэдакцыі „Юманітэ"

ПАРЫЖ, 22. Гавас паведамляе: «Сёньня ўвечары судовы следчы зрабіў прагляд дакумантаў, забраных паліцыяй ня пры вобыску на кватэры супрацоўнікаў «Юманітэ» Касіё (ён-жа Фаен), так і ў вайсковым аддзеле рэдакцыі «Юманітэ» Прагляд дакумантаў адбываўся ў прысутнасьці абвінавачаных, іх абаронцаў, дырэктара інфармацыйнага аддзелу парыскае прэфэктуры, паліцыі і прадстаўніка вайсковага міністэрства. Сярод дакумантаў фігуруюць лісты салдат і маракоў, якія галоўным чынам зьмяшчаюць скаргі на вайсковую службу. Прагляд патрабаваў доўгага часу і вынікі яго трымаюць у таямніцы.

Нота Англіі ўраду СССР

АНГЛІЯ ЗАПРАШАЕ Ў ЛЁНДАН АДКАЗНАГА САВЕЦКАГА ПРАДСТАЎНІКА ДЛЯ АБГАВАРЭНЬНЯ СПРЭЧНЫХ ПЫТАНЬНЯЎ, ІСНУЮЧЫХ ПАМІЖ ЁЮ І ЎРАДАМ СССР, У МЭТАХ АДНАЎЛЕНЬНЯ ДЫПЛЁМАТЫЧНЫХ ЗНОСІН

Адказная нота Савецкага ўраду

Для абгаварэньня спрэчных пытаньняў з Англіяй урад СССР пасылае ў Лёндан т. Даўгалеўскага

(Начное радыё)

МАСКВА, 23. 17-га ліпеня, часова выконваючы абавязкі ўпоўнаважанага па справах Нарвэгіі ў Маскве, п. Данізльсон, перадаў ураду СССР ноту брытанскага ўраду наступнага зьместу:

**— Урад яго вялікасьці старанна разгледзеў існуючыя паміж Англіяй і СССР адносіны і гатоў аднавіць дыпляматычныя зносіны з СССР, мяркуючы, што ўзаемныя правы і абавязкі, якія вынікаюць з міжнароднага права, буд

Аршанскія работнікі саюзу сельгаспрабочых правалілі працдагаворную кампанію

Замест 8000 дагавароў—заключылі 3863

Зарплата пастухоў ніжэй зарплаты мінулага году

Малюнак поўнай бязьдзейнасьці, ня дбайнасьці і напляваецельскіх адносін да сваіх абавязкаў з боку прафработнікаў саюзу сельгаслесрабочых Воршы выяўляюць вынікі працдагаворнай кампаніі на вёсках Аршанскай акругі на сёньняшні дзень. Замест 8 тысяч працдагавароў па батракоў і пастухоў заключана толькі 3.863 дагаворы. Прымаючы пад увагу, што кантрольная лічба ў 8 тысяч дагавароў складае толькі 60 проц. агульнага ліку батракоў Аршанскай акругі, працуючых па найме (згодна вестак ЦСУ), трэба адзначыць, што амаль тры чверці батрацтва Аршанскай акругі не знайшлі абароны сваіх інтарэсаў з боку прафсаюзнай арганізацыі.

Але і падпісаныя дагаворы маюць вялікія прамахі. Пастухі ў мінулым годзе атрымлівалі ў сярэднім натурай 60-70 пудоў хлеба, сёлета яны атрымліваюць толькі па 20-30 пуд. Тлумачыцца гэта тым, што кулакі ацэньваюць пуд хлеба ў 5-7 руб., а прафсаюзныя органы нічога не зрабілі для таго, каб устанавіць на хлеб каапэрацыйную цану, альбо выдаваць зарплату пастухом грашыма, а ня хлебам.

З агульнага ліку падпісаных працдагавароў (3.863) толькі па 130 прадугледжана сацыяльнае страхаваньне. І гэта толькі па Талачынскім раёне У астатніх раёнах нічога ў адносінах страхаваньня батрацтва і пастухоў амаль ня зроблена.

Чым-жа тлумачыцца такое зьявішча? Па-першае, вялікай нядбайнасьцю аршанскіх прафпрацаўнікоў Акруговае праўленьне саюзу сельгаслесрабочых не зьвярнула выстарчальнай увагі на свае часовае вылучэньне і падрыхтоўку прафсаюзнага актыву для дапамогі сельрабочкам. Даныя дырэктывы не правяраліся. Інструктарскі апарат праўленьня саюзу праспаў. Ён ня меў канкрэтнага пляну працы, ня меў увязкі з раённымі ўпаўнаважанымі па працы.

Па другое, у разгары кампаніі практыкавалася зьмена кіруючага складу сельрабочкомаў, частая перакідка старшынь рабочкомаў на іншую працу, у прыватнасьці пераводзіліся на іншую працу таварышы, якія скончылі батрацкія курсы.

Патрэбне, райупаўнаважаныя па працы за ўвесь час працдагаворнай кампаніі не абсьледвалі ніводнай кулацкай гаспадаркі і не адмянілі ніводнага кабальнага дагавору, у той час, як на Менскай акрузе колькасьць адмененых кабальных дагавароў дасягае тысячы.

Такія адносіны прафсаюзных і іншых адказных працаўнікоў да працдагаворнай кампаніі прывялі да таго, што кампанія, па Аршанскай акрузе амаль сарвана, а ў паасобных выпадках мы маем скрыўленьне клясавай лініі. Напрыклад, на 1400 кулацкіх гаспадарак па акрузе заключана ўсяго 6 дагавароў на падставе кодэксу законаў аб працы, а ўсе астатнія дагаворы заключаны на падставе часовых правіл, якія павінны быць ужыты выключна ў адносінах да серадняцкіх гаспадарак. Адсутнасьць кантролю мас над ходам кампаніі спрыяла таму, што некаторыя сельсаветы рэгістравалі яўна кабальныя дагаворы (Славенскі сельсавет, Талачынскага раёну).

Такім чынам, уся абстаноўка прывяла да зрыву важнейшай кампаніі на вёсцы.

Газэта «Беларускі Батрак», якая зьмяшчае інфармацыю аб гэтым факце, высоўвае рад патрабаваньняў:

Першае—мабілізаваць і кінуць на вёску, на заключэньне і праверку дагавароў увесь саюзны апарат, увесь саюзны актыў.

Другое—прымусіць раённых ўпаўнаважаных па працы сумесна з работнікамі саюзу сельгаслесрабочых самым актыўным чынам прыняцца за праверку ужо заключаных дагавароў, адмяніць кабальныя дагаворы і дапамагчы перазаключэньню дагавароў на аснове запатрабаваньняў саюзу.

Трэцяе—у сапраўднасьці арганізаваць дапамогу і кіраўніцтва з боку вясковых, партыйных і камсамольскіх арганізацый заканчэньнем працдагаворнай кампаніі і праверкаю дагавароў.

Чацьвертае—асабліва моцна націснуць на кулацкія гаспадаркі, уплываючы на кулакоў—наймальнікаў штрафамі, пастаноўкай паказальных працэсаў у нарсудох.

Да гэтага мы лічым патрэбным дадаць яшчэ адну прапанову. праверыць склад аршанскіх прафпрацаўнікоў саюзу сельгаслесрабочых з пункту погляду таго, ці здольны яны выконваць дырэктывы партыі ў галіне абслугоўваньня і збораны інтарэсаў батрацтва і праводзеньня выразнай клясавай лініі ў барацьбе з кулацтвам.

П-н.

Толькі генэральная лінія партыі забясьпечвае пасьпяховае разьвіцьце сельскай гаспадаркі

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА БССР СВАІМ САПРАЎДНЫМ СТАНАМ ПАКАЗВАЕ НАКОЛЬКІ БЕЗПАДСТАЎНЫ І БЯЗГЛУЗДЫ СЬЦЬВЯРДЖЭНЬНІ І ВЫКРЫКІ ПРАВЫХ АПАРТУНІСТЫХ АБ „ЗАСТОІ", АБ „ДЭГРАДАЦЫІ"

ЯШЧЭ ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ РАБОТУ ПАРТ'ЯЧЭЕК ВЁСКІ ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Аб „дэградацыі" сельскае гаспадаркі

Сапраўднасьць у разьвіцьці сельскае гаспадаркі адхіляе сьцьвярджэньне правых апартуністых аб «дэградацыі» сельскае гаспадаркі.

Сельская гаспадарка БССР ідзе па шляху свайго далейшага разьвіцьця і ўмацаваньня.

«Устаноўка, узятая ў апошні час, прывяла асноўныя масы сялянства да *беспрасьветнасьці і беспэрспэктыўнасьці*»... «Пануючыя ў вёсцы настроі вядуць да дэградацыі сялянскае гаспадаркі»...

Так гаварылі нядаўна прадстаўнікі права-апартуністычнай апазыцыі ў нашай партыі.

Сапраўднасьць, аднак, разьвівалася іншымі шляхамі і дае малюнак адваротнага характару.

Мы маем ужо зараз магчымасьць падагуліць тыя чынныя адказы, якія даны правым апартуністым, у прыватнасьці, беларускім сялянствам.

Паводле даных вясеньняй анкеты, якую нядаўна правяло ЦСУ праз сваіх карэспандэнтаў, пасеўная плошча ўсіх культур у бягучым годзе павялічылася на 2,0 проц. супроць папярэдняга году.

У прамове сваёй на лістападаўскім пленуме ЦК т. *Сталін* сказаў:

«Калі-б мы мелі гаспадарчую беспрасьветнасьць і беспэрспэктыўнасьць асноўных мас серадняка, серадняк не пашырыў бы яравога кліну».

Паданыя факты аб павялічэньні пасеўнай плошчы могуць служыць ясным паказчыкам тых настрояў і тэндэнцый, якія фактычна (а не па выдумках правых) пануюць у нас на вёсцы.

Асобна па катэгорыях пасеву рост пасеўных плошчаў характарызуецца наступнымі днямі:

Плошча азімых пасеваў 1929 г. *павялічылася супроць плошчы 1928 г. на 1,1 проц.* Гэта, праўда, невялікі процант павялічэньня плошчы, але ўсё-ж гэта процілегла дэградацыі.

Плошча-ж яравых пасеваў бягучага году ўжо *павялічылася* супроць плошчы мінулага году на *2,15 проц.*

Мы маем у наяўнасьці ня толькі просты рост пасеўных плошчаў, але і цэлы рад іншых зьявішч, якія сьведчаць аб сур'ёзных, станоўчых зрухаў, што адбыліся ў сялянскіх гаспадарках БССР.

Так, напрыклад, выяўляецца ў гэтым годзе рашучы нахіл у бок інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі, што відаць з наступных даных: пры амаль стабільным стане разьмеру пасеўных плошчаў пад яравыя збожжавыя культуры (99,3 проц.) *пасеўная плошча ільну павялічылася на 7,26 проц.* супроць плошчы мінулага году.

Аднак, дзеля таго, каб больш поўна ўявіць сабе значэньне гэтага зруху, трэба яшчэ ўлічыць, *што лён* (як і ўсе тэхнічныя культуры) *больш працаёмкі, чым культуры збожжавыя.*

Даныя бюджэтных абсьледваньняў дазваляюць устанавіць, што працаёмкасьць ільну складае 315,24 проц. *працаёмкасьці збожжавых культур. Пашырэньне пасеўнай плошчы ільну азначае, такім чынам, таксама значнае (на 215,24 проц. на кожную дзесяціну) павялічэньне працоўных затрат сялянства на ўздым сваёй гаспадаркі.* Зусім ясна, што пры «беспрасьветнасьці» такія затраты ня робяцца.

Але акрамя таго, побач з гэтымі зрухамі ў сыстэме паляводзтва, мы маем таксама ў гэтым годзе і зрухі вялікага сацыяльнага і палітычнага значэньня. Гэта знаходзіць сваё выяўленьне ў тым, што на фоне агульнага росту пасеўных плошчаў—у большай меры вырасьлі пасеўныя плошчы ніжэйшых, менш магутных груп вёскі. Аб гэтым сьведчаць наступныя даныя, аб суадносінах пасеўных плошчаў 1929 г. да 1928 г. па асобных групах:

Групы па жывёле.	Уся пасеўная плошча	Азімыя	Яравыя	Лён.
Без рабочае жывёлы .	107,69	105,29	108,93	116,85
З 1 адзн. раб. жывёлы .	101,49	101,40	101,26	108,07
З 2 адзн. раб. жывёлы .	101,61	99,41	102,62	102,62
З 3 адзн. раб. жывёлы .	104,25	103,35	104,45	110,34
З 4 адзн. раб. жывёлы .	104,27	95,77	109,23	120,54

Рост пасеўнасьці малазаможных груп сялянства заўважаецца па ўсіх культурах.

Аднак, побач з гэтым мы маем таксама прырост пасеўных плошчаў у сялянства, заможных груп і нават у кулацкай верхавінцы (в 4 азімымі рабочае жывёлы), асабліва па ільну (20,54 проц.) і па яравых (9,23 процантаў).

Між тым, т. *Фрумкін* зусім яшчэ ня так даўно пісаў, што «ўсякі стымул палепшаньня гаспадаркі—паралізуецца небясьпекаю быць залічаным

Адносна гаспадарчага ўзьніму бяднякіх гаспадарак БССР сьведчаць яшчэ і наступныя даныя: частка (у мінулым годзе) сялянства, якое ня мела жывёлы, набыла ўжо ў гэтым годзе 12.650 коняй і 410 валоў. У групе сялянства з адной адзінкай рабочае жывёлы колькасьць коняй павялічылася на 4,92 проц.

Аднак, можа паўстаць пытаньне, ці вынікаюцца паказаныя зрухі вынікам нашай палітыкі,—або, быць можа, яны зьяўляюцца вынікам якога-небудзь «стыхійнага» працэсу і выпадковых фактараў.

На гэтае пытаньне яскрава адказнамікі пасеўных плошчаў у гаспадарках, што карысталіся дзяржаўнаю дапамогаю (крэдыт, кантрактацыя, высокагатункавае насеньне і г. д.) і ў гаспадарках, якія не атрымалі гэтай дапамогі.

Процантныя адносіны пасеўных плошчаў 1929 г. да разьмераў плошчаў папярэдняга году.

Група гаспадарак	Уся пасеўная плошча.	Азімыя.	Усе яравыя.	Яравыя збожжавыя.	Лён.
Атрымаўшых дапамогу . .	103,77	101,46	103,80	99,87	113,49
Не атрымаўшыя	100,90	100,77	100,62	98,85	100,20

Па ўсіх культурах мы маем больш высокія разьмеры прыросту пасеўных плошчаў у гаспадарках, што атрымалі дзяржаўную дапамогу. Нават па яравых збожжавых, па якіх пасеўная плошча крыху скарацілася (на 0,70 проц.) за кошт значнага прыросту плошчы ільну—мы таксама бачым, што гэта скарачэньне прыпадае амаль поўнасьцю на гаспадаркі, не атрымаўшыя дзяржаўнай дапамогі. У гаспадарках, якія карысталіся дапамогаю дзяржавы, пасеўная плошча і пад яравыя збожжавыя амаль не скарацілася (на 0,13 проц.).

Мы маем права таксама запытаць, уздыму якіх груп сялянства больш за ўсё спрыяе дапамога, якая аказваецца сялянству дзяржаваю?

На гэтае запытаньне адказваюць наступныя данныя аб адносінах пасеўных плошчаў 1929 г. да разьмераў плошчаў папярэдняга году ў гаспадарках паасобных груп.

Групы гаспадарак.		Уся пасеўная плошча.	Азімыя.	Усе яравыя.	Яравыя збожжавыя.	Лён.
Па забясьпеч. жывёлай.	Па дзяржаўн. дапамозе.					
Без рабочае жывёлы . .	Атрым. дапам.	111,92	107,52	114,64	112,48	123,61
	Не атр. «	102,18	104,85	101,06	99,81	102,72
З 1 адз. раб. жывёлы . .	Атрым. дапам.	103,53	101,86	103,88	98,79	114,77
	Не атр. «	100,02	100,67	99,36	100,0	98,30
З 2 адз. раб. жывёлы . .	Атрым. . .	101,75	98,58	102,97	98,45	105,33
З 3 і больш. адз. раб. жыв.	Атрым. . .	98,24	90,39	102,24	99,5	110,36

Паданыя лічбы досыць яскрава сьведчаць аб тым, што дапамога, якая аказвалася сялянству дзяржавай, ішла па лініі дапамогі гаспадарчаму ўзьдыму галоўным чынам, *малазаможным сялянскім гаспадаркам.*

Нарэшце, падамо наступныя даныя адносна дынамікі ўраджайнасьці па БССР.

Катэгоры гаспадарак	Разьмер ураджайнасьці ў пудах з адзнай дзесяціны. 1927-28 г.	1928-29 г.
Сялянскія гаспадаркі . . .	43,7	47,5
Саўгасы	59,6	69,2
Калгасы	47,8	54,6

Мы бачым, такім чынам, што ўраджайнасьць у гэтым годзе вырасла супроць мінулага году: у сялянскіх гаспадарках на 8,7 проц., у савецкіх на 16,1 проц., у калгасах на 14,2 проц. (Больш высокія прыросты росту ўраджайнасьці ў саўгасах і калгасах тлумачацца перавагамі калектыўных форм гаспадараньня супроць індывідуальнага гаспадараньня).

Так бязьлітасна само жыцьцё перакуліла і высьмеяла ўсе злосныя выдумкі правай апазыцыі аб «дэградацыі» сельскае гаспадаркі і «намылк васьці» палітыкі партыі на вёсцы.

Я. Пайкін

ДЫРЭКТЫВА УРАДУ БССР АБ ВАПНАВАНЬНІ—ПАД ПАГРОЗАЙ НЕВЫКАНАНЬНЯ

ЗАМЕСТ 63 МЛЫНОЎ ПАБУДАВАНА 8.—ЯШЧЭ НЕВЯДОМА, ДЗЕ АБСТАЛЯВАЦЬ 22 МЛЫНЫ.—ДРАБІЛКІ ВЫХОДЗЯЦЬ З СТРОЮ.—ПЫТАНЬНЕ АБ ІЛЬГОТНЫХ ТАРЫФАХ НЯ ВЫРАШАНА.—БЮРАКРАТЫЗМ—АДНА З ГАЛОЎНЫХ ПРЫЧЫН НЕВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ

Ужо хутка падыходзіць восень. Набліжаецца час асеньняе сяўбы. Таму гаварыць аб пэрспэктывах вапнаваньня ўжо позна; трэба выяўляць, што робіцца ў даной справе і што фактычна будзе зроблена. А калі абмяркоўваць закранутае пытаньне з такога пункту погляду, дык можна ўпэўнена сказаць, [illegible] Селета [illegible] на заданьне правесьці вапнаваньне ў БССР на плошчы 25.000 гэктараў. 5.000 гэктараў з гэтай колькасьці прыпадала на азіміну, якая ўвосень будзе засеяна і 20.000 гэкт. на ярыну 1930 г.

Калі рабіць так, як патрабуе навука, дык вапнаваньне пад азіміну трэба было распачаць ужо ў маі-чэрвені.

Гэтую работу, праўда, і зараз яшчэ ня позна выканаць. Плошчу пад ярыну можна вапнаваць і ў верасьні.

Прайшоў май і чэрвень. Праходзіць ужо і ліпень, а вапнаваньне ўсё яшчэ не пачалося.

Чаму?

Каб выканаць плян вапнаваньня плошчы ў 25.000 гэктараў павінны былі быць арганізаваны 63 млыны па перамоле вапны. Вось гэтых якраз млыноў да апошняга часу яшчэ і няма.

Папершае, невядома, дзе такія млыны будаваць? А абсталёўваць іх трэба ў такіх мясцох, дзе ёсьць поклады вапнякоў. На абавязку ВСНГВ і беларускай Акадэміі Навук было дасьледваць рад месц у БССР, каб знайсьці такія пункты, якія адпавядалі-б патрабаваньням, г. зн. знайсьці месцы выхадаў вапнякоў. Да гэтага часу гэтая работа вялася вельмі марудна. Такіх месц устаноўлена 41.

Такім чынам, трэба канстатаваць, што ў гэтай частцы заданьне па арганізацыі справы вапнаваньня выканана на сёньняшні дзень на процантаў 65. Горны аддзел ВСНГВ абяцае рэшту пунктаў намеціць да 1-га верасьня. Аднак, нельга быць упэўненым, што гэтае абяцаньне будзе ў тэрмін выканана.

На жаль іншыя арганізацыі, на якія ўскладзена арганізацыя справы вапнаваньня, работы па сваёй лініі ня выканалі і на 65 проц. Возьмем, напрыклад, Белсельсаюз. Гэта тая арганізацыя, на якую ўскладзены абавязак абсталёўваць млыны і кіраваць іх работай. Аказваецца, што да сучаснага моманту па ўсёй Беларусі абсталяваны па вестках ВСНГ толькі адзін млын, а па вестках Белсельсаюзу — 8. Так, або інакш, але абедзьве лічбы яскрава сьведчаць аб тым, што млыны ў нас яшчэ не арганізаваны.

Варта адзначыць чыста бюракратычныя адносіны да гэтай справы. У пачатку лета Белсельсаюз, калі ад яго патрабавалі тлумачэньняў, чаму не абсталёўваюцца млыны, адказваў, што заводы ня прысылаюць рухавікоў і драбілкі. Такога становішча, праўда, было. З спазьненьнем. Але, калі тое-ж самае запытаньне задаецца Белсельсаюзу зараз, калі ўжо дастаўлена значная частка абсталяваньня, дык ён адказвае: млыны не абсталяваны таму, што ВСНГВ яшчэ ня вызначыў месц выхаду вапнякоў.

Такія апраўданьні ня могуць быць прызнаны сур'ёзнымі. І сапраўды, на мясцох ужо ёсьць 48 драбілак і 49 рухавікоў; пунктаў, дзе можна ўстанавіць млыны, вызначана ўжо 41. Дык чаму-ж хоць у 40 пунктах ужо не абсталяваны млыны? На гэта запытаньне мы адказаць ня можам.

Між іншым невялікая практыка работы на драбілках прымушае сыгналізаваць яшчэ адну небясьпеку. Драбілкі гэтыя выробляюцца ў Менску на заводах «Камунар» і «Энэргія» У свой час «Зьвязда», калі яшчэ рабіліся спробы з пускам гэтых драбілак на заводах, адначала дрэнную якасьць гэтых драбілак. Здаецца, што потым рабіліся некаторыя ўдасканаленьні ў канструкцыі драбілак, але як відаць, нашы прапановы ня былі прыняты сур'ёзна пад увагу. Гэта пацьвярджаюць два наступныя факты. Драбілка, устаноўленая ў Аршанскай акрузе, праз кароткі тэрмін выйшла з строю. З 9-ці драбілак менскіх заводаў, якія былі устаноўлены ў маскоўскім раёне, 6 выйшлі з строю. Акрамя таго, драбілкі вышукваюць нагол размол вельмі дрэннай якасьці. Вапна не падобна на муку, а напамінае даволі дробны пясок. Драбілкі зроблены настолькі дрэнна, што нельга іх рэгуляваць.

З усяго сказанага аб драбілках вынікае, што нельга быць упэўненым у нармальнай работе млыноў, якія будуць пабудаваны. Можа здарыцца так, што ў працягу якіх-небудзь двух тыдняў або месяцу ўсе драбілкі выйдуць з строю.

Нарэшце, аб апошняй перашкодзе ў справе вапнаваньня.—Аб устаноўленьні льготнага тарыфу на перавозку вапны па чыгунцы. З прычыны таго, што поклады вапнякоў знаходзяцца ў аднэй палове Беларусі, а плошча, якую трэба вапнаваць, разьмешчана далёка ад гэтых покладаў, у другой палове БССР,—Наркамзем БССР узбудзіў спачатку перад камітэтам па перавозках пры НКЗШ, а потым перад СПА, хадайніцтва аб устаноўленьні льготных тарыфаў для перавозкі вапны. Да гэтага часу пытаньне ня вырашана. Камітэт па можу.

Невызначэньне ільготнага тарыфу для перавозкі вапны адаб'ецца вельмі дрэнна на правядзеньні ўсяго гэтага мерапрыемства. Цікава, што тона вапны каштуе 7 руб., а пры сучасных тарыфах перавозка тоны вапны на адлегласьці ў 300 кілёмэтраў каштуе... таксама 7 руб. Зусім зразумела, што, калі нашай сельскай гаспадарцы тона вапны будзе каштаваць 14 руб., дык яе будзе не рэнтабельна ўжываць.

Малюнак, які мы тут далі, бясспрэчна, гаворыць за тое, што адно з важнейшых мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці — вапнаваньне—пад пагрозай зрыву. У даным выпадку мы маем на ўвазе ня толькі плошчу пад азіміну, але таксама і плошчу пад ярыну

Аб чым гаворацць паданыя факты? Якія напрошваюцца тут вывады?

Нельга адмаўляць, што справа арганізацыі вапнаваньня — справа новая і нялёгкая. Вязумоўна, тут магчымы перашкоды і шурпатасьці. Аднак, ня гэта вьяўляецца прычынай правалу данага мерапрыемства. Асноўнай прычынай трэба лічыць досыць «халодныя» адносіны адпаведных арганізацый да справы вапнаваньня і, галоўным чынам, з боку Белсельсаюзу. Гэтаму спрыяла таксама адсутнасьць належнага кантролю за выкананьнем данай дырэктывы ўраду.

Вопыт сёлетняй арганізацыі млыноў гаворыць аб тым, што да пабудовы новых 32 млыноў у будучым годзе трэба падрыхтавацца загадзя — яшчэ зімою. Гэтай-жа зімою трэба зрабіць усё магчымае, каб раньняй вясной выканаць на 100 проц. сёлетнюю праграму арганізацыі млыноў.

У зьвязку з фактамі непрыгоднасьці драбілак трэба зараз-жа ўсёбакова расьсьледваць іх, каб тэрмінова ўнесьці адпаведныя зьмены ў канструкцыю драбілак, або палепшыць матар'ял, з якіх яны выпрацоўваюцца.

Хто вінаваты ў гэтым?

В.

Колькі каштавала сусьветная вайна

Набліжаецца 15-годзьдзе са дня пачатку сусьветнай імпэрыялістычнай вайны. Сусьветная буржуазія зможа сьвяткаваць самы страшны свой юбілей —гадавіну арганізаванай ёю страшэннай бойні народаў.

Вайна капіталістых 1914 - 1918 г. г. каштавала народам дзесяткі мільёнаў чалавечых ахвяр. Страты адных толькі ваюючых армій, паводле прыблізных (бадай паменшаных) падлікаў вылічваюцца ў 10 мільёнаў забітых і звыш 20 мільёнаў параненых і пакалечаных. Лік палонных, не малая частка якіх, або загінула, або вярнулася дадому цяжка хворымі людзьмі, складаў 7 з паловаю мільёнаў чалавек.

Каб мець хоць некаторае ўяўленьне аб значэньні гэтых страшэнных лічбаў, успомнім, што ва ўсёй Аўстрыі налічваецца 6 з палов. мільёнаў насельніцтва, у Бэльгіі — 7 з палов. мільёнаў, у Баўгарыі — 3 мільёны, у Даніі 3 з паловай міл., Латвіі — 1 мільён 800 тыс., Літве — 2 з палов. міл., Фінляндыі — 3 з палов. мільён., Эстоніі — 1 мільён 100 тысяч. Такім чынам, адны толькі страты армій забітымі і параненымі ў сусьветнай вайне 1914-1918 г. г. складаюць лічбу ўсяго насельніцтва пералічаных краін.

Гэтыя жахлівыя лічбы людзкіх страт суправоджваюцца ня менш страшэннымі данымі аб матар'яльных стратах ваяваўшых народаў. Яны вылічваюцца, калі падрахаваць кошт разбурэньняў, чалавечае працы, затрачаных на вытворчасьць ваенных матар'ялаў і ўсёй задарма загінуўшай чалавечай працы, — многімі сотнямі мільярдаў рублёў.

Прыблізныя падлікі таго, колькі каштавала вайна, рабіліся ня раз. Амаль усе яны хутчэй паменшаны, як павялічаны, бо амаль нельга ўлічыць усё. Найбольш дакладнае ўяўленьне аб тым, колькі каштавала вайна народам валяваўшых краін, дае вылічэньне народнага багацьця гэтых краін да і пасьля вайны. Паводле падлікаў нямецкіх статыстыкаў, вынікі тут такія.

Народнае багацьце (маемасьць, сродкі) Францыі ацэньвалася да вайны ў 260 мільярдаў залатых марак (марка = 46 з палов. кап.), а да 1919 г. рэзка зьменшылася — складала толькі 180 мільярдаў марак. Такім чынам вайна паглынула ўсю народную працу ваенных гадоў і апрача таго, яна паглынула ранейшыя накапленьні французкага народу, на суму 80 мільярдаў марак. За некалькі год загінулі плады працы некалькіх пакаленьняў рабочых і сялян Францыі.

Народнае багацьце Нямеччыны складала да вайны 375 мільярдаў залатых марак, а да 1919 году вылічвалася толькі ў 250 мільярдаў. Такім чынам страты нямецкага народу яшчэ большыя, як французкія. Народнае багацьце Аўстра-Вэнгрыі, якая да канца вайны развалілася, вылічвалася да вайны ў 170 мільярдаў, а да 1919 году — у 100 мільярдаў; Англіі — да вайны 325 мільярдаў, да 1919 году — 275 мільярдаў марак; Італіі — зьменшылася з 100 да 80 мільярдаў залатых марак у 1919 годзе.

Толькі Злучаныя Штаты нажыліся на вайне. Іх народнае багацьце, якое складала да вайны 850 мільярдаў залатых марак, да 1919 году вылічалася ўжо ў 1,200 мільярдаў марак.

Народам былой Расійскай імпэрыі вайна цара, фабрыкантаў і памешчыкаў каштавала асабліва дорага. Народнае багацьце Расіі, паводле тых-жа вылічэньняў, складала да вайны 250 мільярдаў залатых марак, а да 1919 зьменшылася да 100 мільярдаў залатых марак.

З усіх гэтых даных мы бачым, што калі ўзяць усе матар'яльныя страты на час вайны адных толькі народаў Расіі, Францыі, Нямеччыны, Аўстра-Вэнгрыі, Англіі і Італіі, дык яны складаюць 495 мільярдаў залатых марак. Гэта тое самае, калі-б мы зраўнялі з зямлёю, дашчэнту разбурылі-б, зрабілі пустыню дзьве такіх краіны, як даваенныя Францыя і Расія, або Нямеччына і Італія, або Англія і Аўстра-Вэнгрыя.

Паданыя лічбы даюць даволі яркае ўяўленьне аб тым, колькі каштавала вайна. Яна паглынула мільёны ахвяр, паглынула працу многіх пакаленьняў працоўных, прынесла ім страшэнныя няшчасьці і пакуты. Іменна на плечы працоўных лягі ўсе гэтыя цяжары. На іх долю прыпадае 99 проц. чалавечых ахвяр. На іх лёг і ўвесь цяжар разбурэньняў, выдаткаў на вайну, усіх матар'яльных страт.

Самая крывапралітная рэвалюцыя ня можа каштаваць працоўным і тысячнай долі тых ахвяр, разбурэньняў і шкоды, якія прынесла мінулая вайна, што вялася дзеля інтарэсаў капіталу.

Капіталістыя і сацыял-дэмакраты рыхтуюць зараз новую, іншую страшную, як у 1914 г. бойню паміж сабою, з аднаго боку, супроць СССР, — з другога.

Згуртавацца ў адно, узмацняць свае сілы, рыхтаваць рэвалюцыйны адпор гэтай вайне — важнейшы абавязак, кроўная справа ўсіх працоўных СССР і ўсяго сьвету.

Д. Р.

Кожны камуністы павінен стаць пачынальнікам калектывізацыі

З агульнага ліку сялян-камуністых толькі 8,83 проц. зьяўляюцца членамі калгасу. У гэтай справе патрэбен рашучы перапом

«У цяперашні пэрыяд задача аб'яднаньня і перабудовы дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя павінна быць пастаўлена ў якасьці асноўнай задачы партыі на вёсцы. Катэгарычна паказваючы на тое, што гэты пераход можа адбывацца толькі пры згодзе на гэта з боку працоўных сялян, партыя прызнае неадкладным пырока разгарнуць прапаганду неабходнасьці і выгаднасьці для сялянства паступовага пераходу да буйное аграмаджанае сельскае гаспадаркі»... (Рэзал. 15 зьезду УсеКП(б) аб рабоце на вёсцы).

Партыя забараняе прымусовую калектывізацыю сельскае гаспадаркі. Работу па ўцягненьні сялянства ў калгасы партыя пранапуе весьці мэтадамі прапаганды. Аднак, і без камэнтараў павінна быць зразумела, што пад прапагандай партыя разумее ня толькі славесную агітацыю, а галоўным чынам і ў першую чаргу прапаганду практыкай.

«Мы павінны зараз з асаблівым націскам выпукліць задачу будаўніцтва ўзорных калгасаў... каб самім вучыцца —каб даваць прыклад сялянам» (Калінін. Даклад на 16 партканфэрэнцыі).

Пад прапагандай калектывізацыі трэба разумець, у першую чаргу жывы прыклад, практычны показ.

Зусім зразумела, што творцай і паказчыкам гэтага жывога прыкладу на вёсцы павінен быць, раней за ўсё, камуністы-селянін.

Недарма «Правда» нядаўна ўзьняла на сваіх старонках дыскусію аб тым, ці сумяшчальна для селяніна-камуністага прабываньне ў партыі з вядзеньнем індывідуальнае сельскае гаспадаркі. Агульная думка ўсіх, хто выказаўся ў гэтай дыскусіі, схіляліся да прызнаньня нясумяшчальнасьці гэтых двух палажэньняў.

Таму прадстаўляе надзвычайна вялікую цікавасьць прасачыць і характар удзелу членаў КП(б)Б у калектывізацыі сельскае гаспадаркі БССР, дзе калгаснае будаўніцтва да апошняга часу яшчэ не асабліва пырока разгорнута.

Па даных перапісу вясковых камуністых (Гл. «Зьвязда» № 148, 1929 г.) 8,80 проц. гаспадарак камуністых аб'ядналіся ў калектыўныя гаспадаркі, а ад агульнага ліку сялян—членаў КП(б)Б толькі 8,83 проц. пэрсанальна зьяўляюцца членамі калгасаў (да ўсёй вясковай арганізацыі процант калгасьнікаў будзе яшчэ меншы). Такі процант удзелу сялян-камуністых у калгасах трэба прызнаць надзвычайна нездавальняючым. Калі нават дапусьціць, што матар'ял перапісу дасьць некаторы недавучот фактычнага ўдзелу камуністых у калгасах, ўсё-ж агульны малюнак надзвычайна слабага ўдзелу сялян-камуністых у будаўніцтве калгасаў ня зьменіцца.

Трэба адзначыць, што галоўнымі пачынальнікамі калектывізацыі сярод камуністых-сялян зьяўляюцца дэмабілізаваныя чырвонаармейцы. Так, з агульнага ліку камуністых - членаў калгасаў 53,1 проц. — дэмабілізаваных з Чырвонай арміі, а з іх 69,2 служылі чырвонаармейцамі, 23,21 проц. — у якасьці камскладу і 3,57 проц. — у якасьці палітскладу (у адносінах 4,02 проц. ня высьветлена іх роля ў Чырвонай арміі).

З агульнага ліку калектывізаваных гаспадарак камуністых членаў камун—34,59 проц., членаў арцеляй — 64,16 проц. і таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі — 1,25 проц.

З агульнага ліку калектывізаваных гаспадарак аграмадзілі свае сродкі вытворчасьці: цалкам — 47,12 проц., часткова — 10,78 проц., зусім не аграмадзілі — 2,75 проц. гаспадарак і ўступілі без усякіх сродкаў вытворчасьці—39,35 проц. (гэта пераважна беднякі-батракі).

Аднак, гэтых колькасных паказальнікаў аграмаджаньня яшчэ мала для таго, каб атрымаць поўны малюнак якаснага ўдзелу камуністых у калгасах. Паспрабуем высьвіць апошняе.

Так, сярэдні кошт (на адну гаспадарку) сродкаў вытворчасьці, якія цалком аграмаджаны, складаюць 316 руб. 07 к. Сярэдні-ж кошт аграмаджанай часткі сродкаў вытворчасьці тых гаспадарак, якія напоўнасьцю аграмадзілі свае сродкі вытворчасьці, складаюць 266 р. 72 к. У гэтых гаспадарках захаваліся яшчэ сродкі вытворчасьці ў індывідуальным карыстаньні на 232 руб. 97 кап. або 46,65 проц. на гаспадарку.

Значыць гаспадарка больш магутная пры сваім уступленьні ў калгас, толькі часткова аграмаджваюць свае сродкі вытворчасьці. Гэта з усёй відавочнасьцю вынікае з параўнаньня агульнай сумы кошту сродкаў вытворчасьці гаспадарак поўнасьцю аграмадзіўшых іх і гаспадарак, якія часткова аграмадзілі свае сродкі вытворчасьці. У першым выпадку сярэдні кошт іх на адну гаспадарку складае 316, 07 руб., а ў другім — 499,39 руб.

У якой частцы паасобныя сродкі вытворчасьці аграмаджваюцца і ў якой, наадварот, застаюцца ў індывідуальным карыстаньні? Адказ на гэтае пытаньне дасьць наступная табліца:

Сродкі вытворчасьці.	Проц. аграмаджн. сród. вытворч.	Проц. у індывідуальным уладаньні.
Жывёла . .	64,42	35,58
Інвэнтар . .	42,23	57,77
Пабудовы . .	51,44	48,56

У значнай частцы ўсе сродкі вытворчасьці застаюцца ў індывідуальным карыстаньні, але аграмаджваюцца ў меншай ступені пабудовы і асабліва інвэнтар, г. зн. тыя часткі сродкаў вытворчасьці, якія прадстаўляюць максымальную каштоўнасьць для здачы іх у арэнду і важнейшую аснову для вядзеньня індывідуальнае гаспадаркі.

Але ня толькі сродкі вытворчасьці камуністыя, уступаючы ў калгас, пакідаюць у індывідуальным карыстаньні, умудраюцца захаваць у індывідуальным карыстаньні таксама і зямлю. З агульнага ліку калектывізаваных гаспадарак 5,26 проц. захавалі ў індывідуальным карыстаньні зямлю (у сярэднім на гаспадарку): пахаці — 2,81 дзесяціны і сенажаці — 1,81 дзес. Пры чым два такіх калгасьнікі нават здаюць гэтую зямлю ў арэнду. А пяць гаспадарак калгасьнікаў нават карыстаюцца рабочай сілай (праўда, на кароткія тэрміны і падзённа).

Калі падагуліць паказаныя факты аб захаваньні ў індывідуальным карыстаньні зямлі і сродкаў вытворчасьці і калі ўлічыць якасьць сродкаў вытворчасьці, што пакідаюцца ў індывідуальным карыстаньні, застаецца прыйсьці да выводу, што ў значнай частцы камуністых - калгасьнікаў яшчэ моцны «прыватна-гаспадарчы інтарэс».

Апошняе пацьвярджаецца часткова я

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

МАНЭЎРЫ--ПРАВЕРКА ТАКТЫЧНАЙ ВЫВУЧКІ ВОЙСКА

Аснова надыходзячых манэўраў — праверка тактычнай вывучкі войска. І ўзімку, і ўлетку ўся вучоба была вынесена ў поле. Узяты курс на **практычную палявую вывучку войска.**

За лета трэба дабіцца высокай рухавасьці ўсіх байцоў, пачынаючы ад камандараў і канчаючы камандзірам корпусу. На манэўрах камандваньне спадзяецца ўбачыць шпаркасьць, ініцыятыву і ў той-жа час якасна добрую работу вайсковых і палявых штабаў, якія ўпяршыню ў гэтым годзе таксама перанесьлі сваю работу ў поле.

Вялікая ўвага аддаецца **скарыстаньню тэхнікі.** Манэўры пакажуць, як войска навучылася ўладаць тэхнікай.

Трэцяе асноўнае пытаньне, што адносіцца да манэўраў, гэта — **узаемадзейнічаньне розных родаў войска.** Ва ўзаемадзейнасьці войска мела ў гэтым годзе вялікую практыку, бо пасьля двух месяцаў навучаньня часьці адразу прыступілі да заняткаў на атрадах. Такім чынам узаемадзейнічаньне радоў зброі —пяхоты, артылерыі, авіяцыі, сувязі і г. д. на манэўрах дасьць дадатковую практыку байцом.

На манэўрах трэба будзе праверыць таксама вельмі сур'ёзнае становішча **аб палітрабоце ў полі.** Трэба спадзявацца, што на гэтых манэўрах ня будзе адрыву палітработы ад поля. У нас ужо існуюць групы камандзіраў і палітработнікаў, якія сур'ёзна займаюцца пытаньнямі палітасьветработы ў полі.

Вялікая ўвага будзе зьвернута на **пытаньні вядзеньня гаспадаркі** ў паходзе. У мінулым нагладзіліся выпадкі няўменьня «манэўраваць кухняй», кіраваць абозам і г. д. Гэта было таму, што навучаньне адбывалася казарменым парадкам і не давала магчымасьці гаспадарчаму складу навучыцца кіраваць сваёй гаспадаркай, прыстасаваць гэтую гаспадарку да палявых умоў. Манэўры павінны паказаць баявую вывучку нашых гаспадарнікаў.

Чырвонаармейскія часьці і савецкі актыў на вёсцы павінны правесьці вялікую растлумачальную работу сярод сялянскага насельніцтва цяпер-жа, яшчэ да пачатку манэўраў. Усім кулацкім чуткам павінен быць даны рашучы адпор.

Практыка **асоавіяхімаўскіх арганізацый,** што ўдзельнічалі ў мінулым у манэўрах, побач са станоўчымі дала і шмат адмоўных вынікаў. Асоавіяхімаўцы прыходзілі на нашы манэўры арганізацыйна слаба афармленымі і дрэнна навучанымі, чаму поўнае скарыстаньне іх было вельмі цяжкім. Зараз становішча пытаньне аб тым, каб асоавіяхімаўцы прыходзілі на манэўры толькі пасьля папярэдняй месячнай падрыхтоўцы. Уменьшае дзейнічаць у складзе атрадаў у палявой абстаноўцы — вось на чым павінна быць сканцэнтравана ўвага асоавіяхімаўскіх арганізацый, што ўдзельнічаюць у манэўрах.

Сацыялістычнае спаборніцтва-- не парадны лёзунг

(№-скі ПОЛК, ВОРША)

Больш за ўсё небясьпечна ператварэньне сацыялістычнага спаборніцтва ў парадны лёзунг, у фармальнае выкананьне дагавору. Нам трэба практычнае правядзеньне сацыялістычнага спаборніцтва, нам трэба поўнае ўсьвядамленьне кожным удзельнікам спаборніцтва яго палітычных і практычных задач.

Тое, што выяўлена ваенкараўскім налётам у 7-й роце №-скага палка, гаворыць аб тым, што тут сацыялістычнае спаборніцтва аказёнена, што яно закончылася тады, як было афармлена заключэньне дагавору, прычым гэта заключэньне праходзіла без папярэдняга растлумачэньня практычных задач спаборніцтва.

Мы запыталіся ў члена штаба кіраўніцтва спаборніцтвам:

— Калі вы растлумачвалі чырвонаармейцам задачы спаборніцтва?

Член штаба заявіў:

— Пасьля заключэньня дагавору 2-х узводаў.

— А дзе ў вас гэты дагавор? пацікавіліся мы.

— Да недзе павінен быць.

А гэта недзе аказалася нідзе.

Дагавор заключаны і «грэецца» ў катсьці ў кішэні.

Ні ў лендоміку, ні ў канцылярыі яго няма, чырвонаармейцы ня ведаюць, чаго ім трэба дабіцца па спаборніцтву, таму што дагавору на памяць ня ведаюць.

Ня ведаюць яны, дзе яны адстаюць, і дзе ім трэба падцягнуцца. Аб гэтым ніадзе ні слова. Дошка для стральбы запаўняецца з вялікім спазьненьнем. Так к моманту нашага налёту (17/XII) былі толькі запоўнены весткі аб 3-ім практыкаваньні у той час, як даўно праведзена 6-е практыкаваньне.

На дошцы «вучобы і быту» нічога лепшага не знайшлі вывесіць, як правілы асабістай гігіены.

А дзе вучоба, дзе быт?

На дошцы—сацыялістычнае спаборніцтва» вісяць здымкі з часопісу «Чырвонаармеец».

Чырвонаармейская маса не паінфармавана аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва.

Далей. Рэлігійная работа вычэрпваецца тым, што вісіць «дошка бязбожніка», якая, на жаль не запоўнена.

«Ільлічоўка» абнаўляецца рэдка. Такі факт, як прыняцьце прысягі палком, не знайшоў свайго адлюстраваньня ў газэце. Пляну пазашкольнай работы ў лендоміку няма.

А ўсё гэта дагаворам сацыялістычнага спаборніцтва прадугледжана, па ўсіх гэтых пунктах рота дала пэўныя абавязацельствы.

***

Што трэба зрабіць?

Лёзунг сацыялістычнага спаборніцтва зрабіць зразумелым кожнаму чырвонаармейцу, мабілізаваць усю ўвагу і энэргію на практычнае ажыцьцяўленьне дагавору, заключанага з 190 палком.

Р. Д.

У каваперыйскіх пягерах

Для спортзаняткаў ў лягерах №-й кавалерыйскай дывізіі пабудаваны спэцыяльна вайскова-палявы гарадок і водная станцыя. З 28 ліпеня арганізуецца вайскова-спартыўныя спаборніцтвы. Зацьверджаны перакідны прыз для лепшых камандаў.

Падрыхтоўка вясковых інструктароў

Пры кожным палку №-й дывізіі арганізаваны спэцыяльныя курсы па падрыхтоўцы вясковых інструктароў фізічнай аборонкі ў аппускніко́й-чырвонаармейцаў.

Пралетарыят усіх краін рыхтуецца да 1-га жніўня

Першага жніўня пралетары выйдуць на вуліцы пад сьцягамі Камінтэрну

„НА НАГЛУЮ ПРАВАКАЦЫЮ ЧАН КАЙ-ШЫ АДКАЖАМ ГАТОЎНАСЬЦЮ АБАРАНЯЦЬ СССР"

Набліжаецца 1-га жніўня. Цяжка перадаць у кароткім артыкуле аб тым, як рыхтуюцца замежныя рабочыя да гэтага дня. Пошта кожны дзень прыносіць нам лісты **ад рабочых з розных краін, ад людзей розных нацый,** але ўсе яны гаворацъ аднаю моваю. Усе яны расказваюць аб цяжкім становішчы рабочае клясы, аб надыходзячых клясавых бойках. Усе яны расказваюць аб тым, **як рабочыя рыхтуюцца да 1-га жніўня.**

Але дамо лепш слова самім замежным рабочым.

„Фашыстыя вучацца страляць"

«Ня так даўно,—піша наш венскі рабкор **І. Рот,**—адна з газэт «Дэр Абэнд» надрукавала сьпіс тых месц у Вене, дзе фашыстыя пад кіраўніцтвам дзяржаўных армейскіх афіцэраў вучыліся страляць з кулямётаў. Гэта навучаньне адбывалася ў глыбокіх глухіх сутарэньнях для таго, каб ня чутна была стральніна. Пасьля вымяшчэньня сьпісу, паліцыя, якая добра знаходзіць у рабочых нават маленькі рэвальвэр, ня здолела (а праўдзівей не хацела) знайсьці кулямётаў фашыстых. Сацыял-дэмакраты, кіраўнікі паліцыі, не захацелі сварыцца з фашыстымі і папярэдзілі фашыстых аб налёце паліцыі. І толькі пасьля таго, як фашыстыя на машынах вывезьлі кулямёты, зьявілася паліцыя, якая эламала замкі і нічога не знайшла.

Фашыстыя ўзбройваюцца, фашыстыя рыхтуюцца. **З Нямеччыны ня так даўно ў падарунак венскім фашыстым прыслалі 150 ручных кулямётаў.** А колькі ў іх ёсьць вінтовак—ня ведае і паліцыя. У газэтах кампартыі пісалі аб узбраеньні фашысцкіх атрадаў **газавымі маскамі і газавымі бомбамі.**

Але ўсяго гэтага нібы ня бачыць паліцыя. Яна асьлепла. Што-б сказала яна, каб так узбройваліся рабочыя?

Фашысцкія атрады Вены налічваюць ужо 50 тысяч узброеных фашыстых. **Але пралетарыі Вены таксама рыхтуюцца да клясавых боек.** 1-га жніўня будзе дэманстрацыя тых рабочых, якія ідуць за кампартыяй, якая адна засталася адзінай партыяй рабочых. **Сацыял-дэмакраты заключылі саюз з фашыстымі.** Сотні рабочых вызваляюцца ад уплыву «пацыфістых» — сацыял-дэмакратаў».

1-га жніўня зробім днём забастоўкі

«У цяжкіх умовах прыходзіцца рыхтавацца **сафійскім рабочым** да першай жнівеньскай дэманстрацыі,--піша І. Рызор.—Баўгарыя—краіна разьюшанага тэрору, краіна, дзе ня лічацца з рабочымі, дзе гарачым жалезам хочуць вывесьці «бальшавіцкую» заразу. А таго і ня ведаюць, што гэта зараза ідзе не з Масквы, а разносіцца тымі кулямі, якімі забіваюць рабочых. Арганізаваны жнівеньскі камітэт ўжо выдаў некалькі лістовак да рабочых і сялян Баўгарыі. 1-га жніўня—мы зробім днём забастоўкі, днём дэманстрацыі. Мы будзем патрабаваць: дыплёматычных і гандлёвых зносін в СССР, ніякай імпэрыялістычнай вайны, 8-мігадзіннага рабочага дня. Супроць вайны з СССР, супроць падрыхтоўкі вайны, супроць капіталістычнай эксплёатацыі і рацыяналізацыі, супроць ЗЗД (законнай аборны дзяржавы), мы за забастоўку, за дэманстрацыю».

„СССР не дамо ў крыўду"

«Учора,—піша наш лейпцыгскі рабкор **Вілі Крэй,**—мы даведаліся аб вашым адказе кітайскім хунгузам. Рабочыя нашага хэмічнага заводу горача віталі такі адказ савецкага ўраду. **Даволі беспакараных нападаў на СССР.** Мы не дамо СССР у крыўду, мы ўсімі сродкамі будзем змагацца супроць вайны. Нішто ня прымусіць мяне ісьці вайной на СССР, а таксама і супроць кітайскіх рабочых. Здрадніцкая палітыка Чан Кай-Шы ўжо даўно выкрыта перад рабочымі масамі ўсяго сьвету. Кітайскія рабочыя, не згаджайцеся на махінацыі Чан Кай-шы!

Вестка аб разбойніцкім захвале КУЧ і аб ноце СССР—хутка аблячела ўвесь сьвет. Рабочыя з прыемнасьцю сустрэлі такі рашучы крок савецкага ўраду.

«Перад 1 жніўня,—піша **Эйнар Адамсон** з Гетэборгу, (Швэцыя),—выступленьне кітайскіх катаў супроць СССР — адзначае напаленасьць паветра, якое з хвіліны на хвіліну гатова абярнуцца ў буру. Забарона дэманстрацый у некаторых мясцох — гэта агонія буржуазіі. Наша гетэборгская арганізацыя кампартыі спадзяецца, што 1-га жніўня выйдзе на вуліцы ўся рабочая кляса Гетэборга».

Буржуазія пачала наступленьне на рабочыя арганізацыі, каб гэтым перашкодзіць першым жнівеньскім дэманстрацыям.

Мы чыталі ў газэтах аб налёце на ЦК кампартыі і на яго баявы орган «Юманітэ» у Парыжы, мы чыталі аб забароне ўсіх камуністычных выданьняў у Чэха-Славакіі. **Але рабочая кляса мае магчымасьці прыпыніць гэтыя наскокі.** У Нямеччыне ўтвараецца саюз рабочае абароны на прыкладу аўстрыйскага саюзу. **Рабочыя гатовы да атак.** Вось, што кажуць лісты саміх рабочых.

«У апошні час суровая цэнзура выкрэсьлівала з камуністычных газэт амаль палову выместу. А днямі яна зусім забараніла газэты, бо яны арганізоўвалі рабочых да жнівеньскай дэманстрацыі. Гэтым паліцыя хацела выбіць з рук цэнтральнага камітэту кампартыі кіраўніцтва дэманстрацыяй. Але гэта ёй не ўдалося. **Баявой дэманстрацыяй пралетараў — будзе кіраваць толькі камуністычная партыя.** Сацыял-дэмакраты ня здольны для клясавага змаганьня. Іх песьня ўжо скончана. Яны далёка адыйшлі ад рабочых, — піша нам **Анна Боўда** — рабочая тэкстыльшчыца, **што наведала СССР 3 гады назад.**

Наш адказ--жалезны кулак

«У адказ на забарону саюзу чырвоных франтавікоў, у адказ на наступленьне— мы, **саксонскія камуністыя,** разам з рабочымі выкінулі лёзунг утварэньня новага баявога саюзу пралетараў, які зменіць саюз чырвоных франтавікоў. Па прыкладу аўстрыйскіх таварышоў мы ўтвараем **«саюз рабочае абароны».** Мы ўпэўнены ў тым, што лік членаў гэтага саюзу будзе ўжо значна большы, чым у саюзе чырвоных франтавікоў. З кожным днём ідзе палявьненьне рабочае клясы, з кожным днём пад сьцягі Леніна прыходзяць новыя барацьбіты, якія пад кіраўніцтвам Камінтэрну пойдуць на барыкады за сусьветны Кастрычнік, — так піша адзін з актыўных арганізатараў саюзу чырвоных франтавікоў Заходняй Саксоніі — рабочы друкар, **Отто Бэсьлер.**

Адначасова ён просіць перадаць прывітаньне рабочым друкаром Менску, якіх ён наведаў два гады таму назад.

«Наша міжнародная салідарнасьць— братэрскае адзінства — парука таго, што ніякая сіла не пераможа сталёвай каторгы пралетараў».

***

Наша задача ў зьвязку з МЧД зьвярнуць асаблівую ўвагу на выхаваньне рабочых і шырокіх мас у духу баявога інтэрнацыяналізму.

Мы павінны ўзмацняць нашу сувязь з рабочымі капіталістычных краін. Трэба ўзмацніць сувязь савецкіх рабочых калектываў — з рабочымі Захаду.

Да 1-га жніўня не павінна быць ніводнай ячэйкі МОПР'у, ніводнага заводу, ніводнай фабрыкі, якія-б не паслалі за межы ліста да сваіх братоў па клясе.

Зьм. СЬНЕЖКА.

На нарадзе АПА ЦК КП(б)Б

ПАДРЫХТОЎКА ДА МІЖНАРОДНАГА ЧЫРВОНАГА ДНЯ

23 ліпеня на нарадзе АПА ЦК КП(б)Б былі заслуханы інфармацыі акругкому, райкомаў КП(б)Б, фракцыі ЦСПСБ, прадстаўнікоў газэт, МОПР'у, Асоавіяхіму, КСМ аб ходзе падрыхтоўчай работы да МЧД.

Адзначана, што тэмп падрыхтоўчай працы невыстарчальны. Ня ўсе прафсаюзныя арганізацыі разгарнулі працу па прадпрыемствах сярод рабочых. Усе мясцовыя газэты акрамя «Зьвязды» даводзяць слаба асьвятляюць на сваіх старонках пытаньне аб МЧД. Дакладчыкі [illegible] замест таго, каб спынціца на галоўных момантах палітычнай важнасьці МЧД, абмяжоўваюцца агульнымі фразамі і такім чынам даклады не пакідаюць ніякага ўражаньня. Даклады ня ўвязваюцца з пяцігодкай, выпускам 3-й пазыкі індустрыялізацыі і вярбоўкай лепшых рабочых з вытворчасьці ў партыю. Нашы выдавецтвы яшчэ дагэтуль ня маюць ў выстарчальнай колькасьці належнай літаратуры да МЧД. Асабліва слаба праводзіцца работа на вёсцы.

Вялікую падрыхтоўчую працу разгарнуў МОПР па ўсёй Беларусі, і асабліва іншыя грамадзкія арганізацыі аказваюць слабае падтрыманьне Менакругкому МОПР'у ў правядзеньні карнавалу.

Нарада прапанавала фракцыі ЦСПСБ і ўсім грамадзкім арганізацыям зараз-жа разгарнуць больш шырокім тэмпам падрыхтоўчую працу на прадпрыемствах, па установах да МЧД. На ўсіх сходах і ў гутарках даклады аб МЧД трэба ўвязваць з пяцігодкай выпускам 3-й пазыкі індустрыялізацыі і пытаньнем вярбоўкі лепшых рабочых з вытворчасьці ў партыю. Усім мясцовым газэтам шырока асьвятляць на сваіх старонках пытаньне аб МЧД, згуртоўваючы вакол яго шырокую грамадзкую думку.

Па лініі шэфства над вёскай наладзіць выезды шэфаў у дапамогу вясковым арганізацыям для правядзеньня МЧД. Фракцыі ЦСПСБ, культустановам і ўсім грамадзкім арганізацыям дапамагчы АК МОПР'у ў правядзеньні намечанага карнавалу.

Аб Усебеларускім зьлёце піянэраў

Нарада разглядзела таксама пытаньне аб усебеларускім піянэрскім зьлёце. Адзначана, што ў друку невыстарчальна асьвятляецца пытаньне піянэрскага зьлёту пад пунктам гледжаньня асьвятленьня задач камуністычнага выхоўваньня дзяцей.

Піянэрскі зьлёт павінен узьняць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці, да патрэб піянэраў і ўсіх дзяцей працоўных.

Нарада прапанавала ў часе падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьлёту ў кожным нумары мясцовай газэты высьвятляць падрыхтоўку да зьлёту. Газэты павінны зьявіцца арганізатарамі грамадзкай думкі вакол зьлёту. Газэты павінны арганізаваць на сваіх старонках праверку работы наркаматаў, саветаў, прафсаюзаў і ўсіх грамадзкіх арганізацый, што імі зроблена, што намечаецца ў рабоце сярод дзяцей і як ажыцьцяўляюць партыйныя і камсамольскія ячэйкі кіраўніцтва над піянэратрадамі. Нарада лічыць неабходным арганізацыю пры газэтах нарады з рабкорамі па пытаньнях, зьвязаных з надыходзячым зьлётам. У часе самага Ўсебеларускага зьлёту піянэраў трэба адводзіць спэцыяльныя старонкі, прысьвечаныя зьлёту і пытаньням камуністычнага выхаваньня дзяцей.

ЦУДЗІН.

Пабудова дубільна-экстрактнага заводу

ВСНГБ заслухаў даклад аб пабудове дубільна-экстрактнага заводу ў Рэчыцы. Прэзыдыум пастанавіў прасіць ВСНГБ СССР прапанаваць таварыству «Дубільдель», што будуе завод, максымальна выкарыстаць бягучы сэзон для пабудовы заводу, каб завод пачаў працаваць у будучым годзе.

БУДАЎНІЧАЯ ФАНТАЗІЯ

(Па менскіх вуліцах)

Наглядаючы за дынамікай нашага жыцьця, часамі хочацца фантазіраваць...

Сёньняшні выгляд нашае сталіцы, як быццам выключае прагавітую фантазію.

... На вуліцах адбываецца нешта нязвычайнае... Сотні і тысячы людзей кожны дзень капаюць, грукаюць жалезам, возяць зямлю, шпалы, рэйкі, трубы... На вуліцах вырастаюць монбляны зямлі, каменьня, труб, рэяк, дошак...

Пешаходы, усё роўна як вандраўнікі ў горах, узьбіраюцца і спускаюцца з «гор», што разьмешчаны проста на тратуарах.

Пры першым ветры на вуліцах праносяцца самумы пылу... Аўтабусы вусім хаваюцца ў белым паблаку... Пыл набіваецца ў нос, у вушы, пакрывае дымавым налётам вопратку.

Сёньня Менск набыў «барбарскі» выгляд для таго, каб скінуць з сябе бязкультур'е і провінцыялізм. Аднак, большасьць менчан, наглядаючы ўсе гэтыя прыгожасьці сёньняшніх вуліц, ня лаюцца, не злуюцца. Чаму?

Усё зразумела, усё патрэбна: і каналізацыя, і трамвай, і парк адпачынку. Эпоха конкі, «губэрнатарскай» вуліцы і «губэрнатарскага» саду адыходзіць у мінулае. Надыходзіць эра электрычнага трамваю, Ленінскай вуліцы, парку адпачынку імя Прафінтэрну.

Нараджаецца новы Менск—чырвоная сталіца Савецкай Беларусі.

Каналізацыя ўносіць у нябыцьцё ўсе мяшчанска-чыноўніцкія нячыстоты і забабоны мінулага, а электрычны трамвай, сугучны дынаміцы жыцьця, паімчыць нас па шляху да новай культуры, да лепшай будучыны...

Вось таму хочацца фантазіраваць... аб тым, якой будзе Беларусь у бліжэйшыя часы. Як паставіць яна сабе на службу электрычнасьць, трактар, машыну, як расначне сваю новую сацыялістычную аграрна-індустрыяльную эру.

Пакінуўшы Савецкую вуліцу, мы накіроўваемся на Ляхаўку—туды, дзе рэалізуецца асноўная частка сацыяльнай «фантазіі». Кожны год пакідае тут значны яркі след. Вось бадзёры, цагельна-чырвоны, з вялікімі вокнамі корпус «Бальшавіка». Яшчэ толькі тры гады таму назад тут стаялі ўздоўж вуліцы, карлікавыя дрыўляныя халупкі, ад якіх падыхала цьвільлю і смуродам... Усё менш і менш застаецца памяці аб іх. У гэтым годзе, побач з «Бальшавіком», вырас жэлазьбінны завод, дзе вараз працуюць больш 100 рабочых... «Бальшавік» становіцца бальшавіцкай крэпасьцю, і яго атрад хутка будзе налічваць да 1.000 байцоў.

А вось недалёка наш «пуцілавец»— завод «Энэргія», дзе кожны год прырастаюць новыя карпусы, новыя варштаты і новыя атрады рабочых. «Энэргія» з прадпрыемства саматужнага на сутнасьці шпарка разьвіваецца ў машынабудаўнічы завод. Ня так даўно завод вырабляў амаль толькі вагу і гіры і іншыя дробныя рэчы. Сёньня—завод ужо выробляе такія складаныя рэчы, як такарныя варштаты. Хутка завод будзе мець новы мэханічны цэх, абсталяваны найноўшымі варштатамі. Корпус гэтага цэху ўжо пабудаваны. Завод расьце і расьце. І таму, калі сустрэнеце рабочага з заводу «Энэргія», вы ўбачыце, што ён не без таго, каб трохі пафантазіраваць...

— Так, чорт пабяры, наш завод, ого! Расьце! 645 рабочых—гэта нешта значыць!..

І ён тут-жа пачне разгортваць малюнак бліжэйшых пэрспэктыў свайго заводу...

— «Свой завод»— вось гэта ўсё мацней і мацней урастае ў сэрца нашага рабочага, пранікае ва ўсю яго істоту, выклікае творчы энтузіязм сацыялістычнага спаборніцтва.

Ну вось хіба гэтая «драбніца» не дае падставы для фантазіі? Хіба тут нельга адчуваць рэальнасьці сацыялістычнага адраджэньня Беларусі?

Рабочая Ляхаўка, Сталінбуд даюць размах і стыль нашаму будаўніцтву— гаспадарчаму і культурнаму.

Толькі, калі прыглядзімся і зразумеем, якія працэсы адбываюцца тут,— становіцца зразумелым, чаму яшчэ бедная Беларусь будзе новы універсытэт, і гарадок, трацячы на гэта 7 м. рублёў. Сюды працягваюцца тыя ніткі, што ткуцца на «Бальшавіку», «Энэргіі», у шматлікіх вёсках БССР.

Нам патрэбна шмат культуры, шмат ведаў для мільёнаў людзей, каб выдзейсьніць сваю сацыялістычную фантазію.

Вось таму мы будуем новы універсытэт, у сьцены якога прыдуць новыя сотні і тысячы рабочых, батракоў і працоўных сялян, каб аўладаць узвышынамі навукі. Адзюль, набраўшыся навуковых ведаў, яны рассыплюцца па вёсках—самых глухіх і далёкіх і там будуць тварыць сацыялістычную фантазію.

Наш будаўнічы размах незразумелы толькі абываталю-практыку, нам-жа, рэвалюцыйным фантастам, такі практыцызм не ўласьцівы, бо перд намі раскрываюцца шырокія творчыя кругавіды.

Мы фантасты—і таму шчыра верым, што надыйдзе час, калі ўпадуць усякія штучныя межы, калі прымежныя слупы будуць зданы ў музэй пераможнай пралетарскай рэвалюцыі.

Вось тады Беларускі Дзяржаўны Універсытэт прыме ў свае сьцены сыноў той часткі працоўных беларускіх мас, што сёньня ня могуць і марыць аб навуцы, аб школе.

Так хочацца фантазіраваць, гледзячы на тое, як няўхільна вымяне свой твар Менск—чырвоная сталіца Савецкай Беларусі, а з ёю—і ўся працоўная краіна, ахопленая энтузіязмам і рэвалюцыйнай фантазіяй будаўніцтва сацыялізму!

Але хто адважыцца сумняваецца ў тым, што фантазія мільёнаў не становіцца ўжо рэчаіснасьцю?

Р. Крас—кі.

МЦРК НЯ ВЫКОНВАЕ ПАСТАНОЎ

аб палепшаньні грамадзкага харчаваньня

Гэта адзначыў прэзыдыум гарсавету

Прэзыдыум гарсавету заслухаў даклад аб становішчы грамадзкага харчаваньня ў Менску. Прэзыдыум адзначыў, што ўсе пастановы аб палепшаньні якасьці абедаў, аб пашырэньні водпуску абедаў на дом, аб абслугоўваньні абедамі рабочых на прадпрыемствах, МЦРК ня выконвае. Да гэтага часу яшчэ ня зьнішчана чарга ў сталоўках.

Прэзыдыум гарсавету лічыць ненармальным, што адразу дзьве сталоўкі закрыты на рамонт. У далейшым прэзыдыум прапануе рабіць рамонт, не закрываючы сталовак.

Запрапанавана МЦРК канчаткова дабіцца палепшаньня якасьці абедаў і павялічэньня водпуску абедаў на дом.

Гарсавет прызнаў патрэбным адкрыць новыя сталоўкі на Ляхаўцы, на фабрыцы [illegible].

3-Я ПАЗЫКА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

паскорыць індустрыялізацыю, узмацніць баяздольнасьць краіны

Са ўсіх канцоў БССР паступаюць весткі аб вялізным посьпеху папярэдняй падпіскі

Воля рабочых мас выканана

25-га ліпеня будзе апублікаваны дакрэт аб выпуску 3-яй пазыкі індустрыялізацыі. Саюзны ўрад прыняў пад увагу запатрабаваньні шырокіх рабочых мас і парашыў выпусьціць пазыку, якая дапаможа сваечасова выканаць пляны капітальных работ.

Працоўныя масы БССР з здавальненьнем даведаліся з гутаркі з т. Брухананым („Зьвязда" ад 21 ліпеня) аб пастанове ўраду БССР. Мы сёньня друкуем лісты рабочых, якія дзякуюць урад за выкананьне іх прапановы. Рабочыя ўпэўняюць савецкую ўладу, што ўся сума пазыкі будзе рэалізавана, што 750 мільёнаў р. будуць пакрыты з лішкам.

Нельга сумняваецца ў гэтым, бачачы той вялікі парыў і энтузіязм, якія ахапілі рабочую клясу. Пастановы рабочых сходаў аб 100-процантнай падпісцы на пазыку, вялізны посьпех папярэдняй падпіскі, якая пачала правядзіцца яшчэ тыдзень назад, паказалі ньвёрдасьць і непарушнасьць рабочых мас у справе індустрыялізацыі. Яны паставілі сваёй задачай як мага хутчэй ажыцьцявіць рэканструкцыю прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Іх не запалохаюць ніякія правакацыі і пагрозы імпэрыялістых.

У рэдакцыю «Зьвязды» паступаюць дзесяткі заметак з заводаў, фабрык і устаноў, якія гавораць, што тэмп і разьмер папярэдняй падпіскі на 3-ю пазыку далёка пакідаюць за сабой мінулую падпіску на 3-ую пазыку індустрыялізацыі.

Калектывы заводаў, фабрык, устаноў, вайсковыя часьці канкуруюць паміж сабою ў разьмерах падпіскі. Гэтыя спаборніцтвы дапаўняюць сацыялістычныя спаборніцтвы на лепшую прадукцыйнасьць працы, на лепшую выпрацоўку, і сьведчаць аб вялікім творчым энтузіязьме і адданасьці сацыялізму рабочай клясы.

Можна падаць шмат прыкладаў аб гэтым. На чырвонаштандартным заводзе «Бальшавік» за некалькі гадзін сабрана падпіскі на 5 тыс. р. Рабочыя падпісваюцца на 150—200 проц. заработнай платы. Делегацкі сход рабочых высунуў лёзунг: „Даеш 60"тыс. руб. 3-й пазыкі". Для ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу па ўсіх цэхах арганізаваны камісіі садзейнічаньня.

На вечарах рабочых, інжынэраў і тэхнікаў Асінбуду была арганізавана падпіска на пазыку, якая дала 16 тыс. р.

На заводзе «Камунар» за кароткі час падпіска дала 12 тыс. р.

На Рагачэўскай лесапільні 20 рабочых падпісаліся на 3.000р. і г д. і г. д.

На сходах выносяцца пастановы пачаць вылічэньні першых узносаў ужо з жніўня месяца.

Задача камісій садзейнічаньня на месцах—ня даць астыць гэтаму парыву, рэалізаваць прапановы рабочых, ахапіць падпіскай усё больш і больш лік калектываў.

Б.

Заводы спаборнічаюць у падпісцы

На ўрачыстым адкрыцьці *новай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік»* рабочыя-швэйнікі арганізавалі папярэднюю падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Тут-жа было сабрана звыш 2000 рублёў. Камісія, вылучаная рабочымі, занята далейшым зборам падпіскі.

***

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на *заводзе «Камунар»* ідзе поўным ходам. На сёньняшні дзень падпіска дала ўжо на заводзе звыш 12 тысяч рублёў.

***

На *дражджавым заводзе «Чырвоная Зара»* падпіску зьбірае рабочы т. Гальперын, які першы на мітынгу протэсту супроць падзей на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы падпісаўся на 60 р. Зараз на заводзе сабрана ўжо да 3.500 рублёў.

***

Рабочыя *Менскай гарбарні «Бальшавік»* з вялікім посьпехам праводзяць падпіску па 3-ю пазыку індустрыялізацыі. За кароткі час падпіска дала звыш 23 тысяч руб.

Вітаем выпуск 3-яй пазыкі

З вялікім здавальненьнем я прачытала гутарку з наркамфінам т. Брухананым, надрукаваную ў нядзельным нумары «Зьвязды» аб тым, што ўрад пастанавіў выпусьціць пазыку. Пастанова кажа аб тым, што ўрад ідзе насустрач запатрабаваньням шырокіх мас. Я ўпэўнена ў тым, што новая пазыка сустракае самае шырокае падтрыманьне рабочых. Мне здаецца, што вызначаная сума ў 750 міл. руб. будзе пакрыта з лішкам.

Работніца-дэлегатка **МАХАЕВА.**

***

— Прачытаў я ўчора заяву нашага саюзнага наркамфіна і пераканаўся ў тым, што наш урад хутка выконвае прапановы рабочых. Я лічу, што 3 пазыка зьяўляецца важнейшым укладам у індустрыялізацыю краіны.

Новыя 750 мільёнаў руб., якія дадуць працоўныя, дапамогуць ажыцьцявіць 5-цігодку.

Рабочы-камунальнік **ГАРМАЗ.**

***

— Ад імя нашых рабочых вітаю пастанову аб выпуску пазыкі. Надзеі савецкага ўраду на шырокае падтрыманьне пазыкі мы поўнасьцю апраўдаем.

— Няхай жыве 5-цігодка і 3-я пазыка індустрыялізацыі!

Будаўнік **ГЕРШАНОВІЧ.**

Новыя тысячы рублёў на індустрыялізацыю краіны

На ініцыятыве камсамольскай ячэйкі **Наркамюсту** за адзін дзень 20 ліпеня падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі 55 судовых працаўнікоў г. Менску на 6.000 руб., што складае звыш 100 проц. іх месячнага заработку.

***

У калектыве **Менселькрэдытсаюзу** сума падпіскі складае больш 5000 р. Ініцыятыўная група, якая ўзьняла пытаньне аб падпісцы, падпісалася на 150 проц. месячнай зарплаты. Г-та т.т. Кузьняцоў, Ліўшыц, Гладкі, Німцова, Мінковіч і інш.

***

Падпіска ахапляе ўсё новыя прадпрыемствы і ўстановы.

За апошні дзень падпісаліся—калектыў ЦСУ на 2.000 р., працкалектыў шапавальнікаў—5.000 р., калектыў Лесбелу—на 4.000 р., працаўнікі вайсковага шпіталю на 1.700 р., рабочыя фабрыкі «Адраджэньне»—на 6.500 руб.

Як ідзе падрыхтоўка да дня індустрыялізацыі

У цэнтральных праўленьнях прафсаюзаў

Рабочыя Ленінграду ўнесьлі прапанову рэлігійнае сьвята 6-га жніўня зрабіць працоўным днём. Заклік рабочых Ленінграду знайшоў шырокі водгук сярод рабочых усяго Савецкага Саюзу, у тым ліку і ў нашай Беларусі.

«Працаваць і сродкі скарыстаць на справу разьвіцьця індустрыялізацыі краіны»,—вось думка перадавых рабочых.

Што робяць прафсаюзы для арганізацыі ініцыятывы рабочых? Якая праведзена падрыхтоўчая праца? Дамо некалькі фактаў.

Намесьнік старшыні ЦП саюзу будаўнікоў, тав. **Фаловіч,** паведаміў, што пытаньне аб правядзеньні дня індустрыялізацыі абгаворана на пашыраным пленуме. Пленум заклікаў усіх рабочых будаўнікоў працаваць 6-га жніўня на карысьць індустрыялізацыі краіны.

Праведзена парада старшынь мясцкомаў і рабачкомаў гор. Менску, якая аднагалосна выказалася працаваць 6-га жніўня. Па ўсіх прадпрыемствах і на будаўніцтве праведзены гутаркі з рабочымі па гэтым пытаньні, скарыстоўваюцца для гэтай мэты абедзеныя перапынкі. Растлумачальная прада аб дні індустрыялізацыі зьвязваецца з працай аб калектыўным хаваньні аблігацый 1-й і 2-й пазыкі індустрыялізацыі. На акруговых зьездах саюзу будаўнікоў, якія толькі што адбыліся ў Магілеве, Воршы і Бабруйску, прыняты пастановы працаваць 6-га жніўня і сродкі ўнесьці на справу індустрыялізацыі. З розных месц паступае рад пастаноў рабочых-будаўнікоў аб згодзе працаваць 6-га жніўня. Рабочыя, занятыя на пабудове універсытэцкага гарадка, вадаканалу — вынесьлі аднагалосна пастановы працаваць 6 жніўня і заклікалі рабочых іншых прадпрыемстваў пайсьці за імі.

6-га жніўня адбудуцца вечары рабочых у радзе прадпрыемстваў Менску, прысьвечаныя дню індустрыялізацыі. На вечарох будуць падведзены вынікі праробленага за дзень. «Мы ўпэўнены, —закончыў тав. **Фаловіч,** — што ўся маса членаў нашага саюзу прыме актыўны ўдзел у правядзеньні дня індустрыялізацыі, бо рабочыя-будаўнікі добра зразумелі неабходнасьць шпаркага тэмпу індустрыялізацыі нашае краіны.

Па саюзе друкароў. У пачатку ліпеня рабочыя першай дзяржаўнай друкарні вынесьлі пастанову аб тым, каб працаваць 6-га жніўня. Такія-ж пастановы атрыманы з раду акруговых гарадоў. У цэнтральным праўленьні саюзу нам паведамілі, што рабочыя-друкары яўрэі, у якіх 6-га жніўня лічыцца працоўным днём, адзін з бліжэйшых дзён адпачынку (рэлігійнае сьвята) адпрацуюць на карысьць індустрыялізацыі. Старшыня саюзу тав. **Левін** заявіў: «мы прыцягнем у правядзеньне дня індустрыялізацыі ня менш як 95 проц. усіх рабочых друкароў».

Саюзы **камунальнікаў, чыгуначнікаў** і іншыя шпарка рыхтуюц

МЕНСК

Па Савецкай Беларусі

Растраты і кражы ў с.-г. калёніі Юрцава

ВОРША. (Наш. кар). Летась прагрымеў у газэтах віцебскі спраўдом. Аршанскі застаўся як-то ў баку, ня гледзячы на тое, што яго мінулыя і цяперашнія справы заслугоўваюць увагі шырокай савецкай грамадзкасьці. Асабліва трэба адзначыць усё тое, што робіцца ў с.-г. калёніі спраўдому—Юрцава.

Што толькі не рабілася ў калёніі. Тут і растраты і безгаспадарчасьць, і зладзейства. Кожны начальнік спраўдому і калёніі пакідаў пасьля сябе вельмі «добрую памяць». І калі-б у калёніі працавалі не зьняволеныя, ня людзі, якія пазбаўлены правоў, а рабочыя, як у саўгасах, то ужо даўно былі-б выкрыты ўсе агідпасьці, якія там мелі месца.

Калёнія кожны год высявае да 50 гэктараў жыта. У 1925 годзе ўраджай быў 84 п. з гэктару, а ў гэтым годзе толькі 30 пуд. Аўса засяецца да 50 гэктараў. У 1925 годзе ўраджай аўса быў 116 пуд. з гэктараў зараз—каля 20 пуд. Таксама з бульбай, канюшынай і інш., бо зямля ня ўгнойвалася. Наогул, гаспадарка ўсе гады давала дэфіцыт. Толькі ў мінулым годзе, ня гледзячы на вялікую безгаспадарчасьць, растраты і інш. злачынствы, меўся прыбытак у 5.000 руб. Каб ня было злачынстваў, гаспадарка кожны год давала-б прыбытак.

Быў у калёніі вельмі добры млын, які перамолваў да 600 пуд. збожжа ў суткі. Але гэты млын быў дэфіцытны, яго зусім разбурылі. Узімку ўзяліся яго напраўляць, на што патрацілі звыш 3000 руб., але млын і да гэтага часу не працуе, бо турбіну паставілі ніжэй узроўню вады.

Малочная гаспадарка калёніі ў мінулым годзе дала дэфіцыт у суме 395 руб. Сярэдні ўдой—толькі 4 з палавай літраў (!) малака ад каровы ў суткі. Малако крадуць усе, каму захочацца, пачынаючы з загадчыка калёніі і канчаючы зьняволенымі.

Гадоўля сьвіней у мінулым годзе дала таксама дэфіцыту звыш 1200 руб., цяпер гэтая галіна гаспадаркі зусім зьліквідавана, як няпрыбытковая. Дэфіцыт ад гадоўлі сьвіней быў таму, што Апановіч і іншыя служачыя калёніі бралі сабе вяпрукоў і сала з скідкай у—50, а то і больш процантаў.

Рахункаводзтва ў калёніі пастаўлена дрэнна. Рахункі, запісы на кнігах робяцца згодна загаду Апановіча. Падрахунку сабранага ўраджаю ня было і зараз няма. Лес калёніі таксама зьнішчаецца.

Вось, што робіцца ў с.-г. калёніі Юрцава Аршанскага напраўчага дому. Загадчык калёніі—Апановіч давёў яе даручкі. Гледзячы на тое, як адкрыта крадзе начальства, крадуць і зьняволеныя. Адзін другога пакрываюць.

Начальнік спраўдому Чупанскі абараняе Апановіча. Доўгі час ён трымаў пад сукном заяву зьняволенага аб непарадках, покуль усё ня выкрылася без яго.

Экскурсія „домбалеўцаў" у Маскву і Ленінград

Барысаў (наш кар.). З 14 ліпеня спыніўся на рамонт завод «Домбаль». Для таго, каб рабочыя культурна правялі свой адпачынак, заўком зрабіў наступныя захады: 25-га ліпеня за кошт заўкому выяжджаюць экскурсіі рабочых у Ленінград і Маскву па 20 чалавек у кожнай. Акрамя таго накіроўваецца экскурсіі ў яўрэйскі калгас каля м. Зембіна.

У Маскве і Ленінградзе рабочыя азнаёмяцца з работай буйнейшых заводаў і наведаюць рад музеяў і тэатраў. Адначасова 65 рабочых накіроўваецца ў дом адпачынку.

З першых у апошнія

Барысаў (наш кар.). Дрэнна стаіць справа з замацаваньнем 2-й пазыкі індустрыялізацыі па барысаўскіх прадпрыемствах. Напрыклад, на заводзе імя Домбаля, які ў часе падпіскі на пазыку даў лепшыя вынікі—112 проц. агульнай зарплаты—цяпер прадана каля 60 проц. аблігацый.

Асабліва ганебна вядуць сябе актывісты з фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна". Сакратар заўкому КУЗЬНЯЦОЎ прадаў аблігацый на 120 руб., сакратар парткалектыву ХАЦКЕВІЧ—на 150 руб., былы сакратар парткалектыву АЛЕКСЕЕВА, падпісаўшыся на 80 руб., ня ўнесла ніводнай капейкі.

Хваліцца няма чым

Мазыр (наш кар.). Мазырскія прафсаюзныя і іншыя грамадзкія арганізацыі ня могуць пахваліцца добрымі вынікамі кампаніі па здачы на хаваньне аблігацый 2-ой пазыкі індустрыялізацыі.

Усяго па акрузе пакуль што здана 62.000 руб., што складае 14,3 проц. да агульнай сумы рэалізацыі, пры чым, галоўная сума здачы на хаваньне прыпадае на Мазыр (47.000 р.) і толькі каля 15.000 р. на акругу.

[illegible] адзначыць, што [illegible] ЦРК) [illegible] ацыі яшчэ не здалі.

Асабліва адстаюць: Пятрыкаўскі, Азарыцкі і Тураўскі раёны, у якіх амаль што нічога ня зроблена.

Акруговая канфэрэнцыя МОПР'у

МАГІЛЕЎ (наш кар.). 20 ліпеня адкрылася акруговая канфэрэнцыя МОПР'у Магілеўшчыны. На канфэрэнцыі прысутнічае 200 дэлегатаў.

Канфэрэнцыя заслухала даклад сакратара АК КП(б)Б тав. Нейланда аб міжнародным становішчы. Канфэрэнцыя вынесла катэгарычны пратэст супроць нападу кітайскіх імперыялістых на Кіт.-Усх. чыгунку.

Курсы для вылучэнцаў ў Магілеве

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). У канцы гэтага месяца ў Магілеве адкрываюцца курсы для перападрыхтоўкі вылучэнцаў, якія працуюць у савецкіх установах. Курсанты будуць займацца вечарамі па 20 гадзін у тыдзень. Акрыванком адпусьціў на арганізацыю курсаў 1.000 руб.

17 новых сямігодак

МАГІЛЕЎ (наш кар.). Па Магілеўскай акрузе ў гэтым годзе адкрываецца 17 новых сямігодак, 152 камплекты пачатковых школ і аднагадовыя пэдкурсы.

Усяго ў сярэднія навучальныя ўстановы акругі будзе прынята ў гэтым годзе 635 чал.

Справа бандытаў—падпальшчыкаў

Гомель (наш кар.). У вёсцы Сьвяцілавічы, Веткаўскага раёну, выязная сэсія акрсуду пачала разглядаць справу [illegible] бандытаў, якая на працягу 5 год тэрарызавала насельніцтва вёсак.

На справе выкліканы [illegible] Разгляд справы працягнецца каля месяцу. Насельніцтва вельмі цікавіцца працэсам.

Скончыўся конкурс праектаў пабудовы дому ўраду

І-ую прэмію атрымаў праект пад дэвізам „Беларус—Беларусі"

Гэтымі днямі скончыўся конкурс праектаў пабудовы дому ўраду.

На конкурс прадстаўлена 17 праектаў, з іх 5 атрымалі прэміі і 1 мярнуецца набыць.

1-ю ПРЭМІЮ атрымаў праект пад дэвізам «БЕЛАРУС—БЕЛАРУСІ». Вартасьць праекту: ён найлепшым чынам вырашае задачу стварэньня вольнай плошчы перад домам ураду, для мітынгаў, дэманстрацый і г. д., пастаўленую конкурснай камісіяй. Аўтар даў прыгожае архітэктурнае афармленьне будынку.

ДРУГУЮ ПРЭМІЮ атрымаў аўтар праекту пад дэвізам «ІЗІ». У гэтым праекце добра распрацованы паасобныя дэталі пабудовы.

3-ю ПРЭМІЮ—праект пад дэвізам «НА ВАРЦЕ».

4-Ю І 5-Ю ПРЭМІЮ—праекты пад дэвізамі «ДЗЯРЖАВА» і «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ».

Мярнуецца набыць праект «Чырвоная Зорка», выкананы надзвычайна добра, але без ачоту асноўных запатрабаваньняў камісіі.

Акрамя таго па спэцыяльным заказе камісіі прыслаў свой праект архітэктар ЛАЎРОЎ.

Праект, узнагароджаны 1-ай прэміяй, прадугледжвае пабудову дому на 6-10 паверхаў, які зьмесьціць усе цэнтральныя савецкія ўстановы гораду. Карысная плошча дому—20 тысяч кв. мэтраў.

Для першай прэміі назначана сума ў 5 тысяч рублёў, для другой—4 тыс. руб., для 3-й—3 тыс. р., для 4—2 тыс. р., для 5—1 тыс. руб.

25 ліпеня закрыецца выстаўка праектаў і будуць абвешчаны прозьвішчы аўтараў прэм'яваных праектаў. Пакуль што конкурсная камісія ня ведае сапраўднага прозьвішча аўтараў, паколькі не распячатаны прысланыя канвэрты.

35 лікпунктаў для сэзонь-нікаў

На буйных пабудовах Менску арганізавана 30 лікпунктаў для ліквідацыі напісьменнасьці сярод будаўнікоў. Для рабочых Водаканалу-сэзонькіраў у інтэрнатах адчынена 5 лікпунктаў. Арганізавана перасоначная бібліятэка на 3.000 тамоў. Намечана арганізаваць школу прафасьветы на 50 чалавек і курсы па тэхніцы безапаснасьці.

160 тысяч рублёў на ўздым ураджайнасьці саўгасаў

Белсельтрэст атрымаў ад Белсельбанку 160 тысяч рублёў на палепшаньне савецкіх гаспадарак. Сродкі будуць выкарыстаны на набыцьцё мінэральнага ўгнаеньня, рагатай жывёлы і насеньня.

Пабудова ільняна-сушыльных пунктаў

Белсельбанк перавёў 105 тысяч рублёў Аршанскаму, Віцебскаму і Полацкаму Акрсельбанкам на крэдытаваньне пабудоў ільняна-сушыльных пунктаў.

Пашырэньне працкалектываў утылізацыі

Наркампрацы БССР пастанавіў значна пашырыць працкалектывы ўтылізацыі. Зараз у гэтых працкалектывах працуе 957 чалавек, у наступным годзе колькасьць рабочых будзе павялічана да 1570 чал.

Пашыраецца завод „Камунар"

У гэтым годзе на заводзе «Камунар» будзе пераабсталяваны пашыраны ліцейны цэх, а таксама прыступлена да пабудовы новага кавальнага цэху.

Выезд урадовай камісіі

Сёньня ў Віцебск для ажыцьцяўленьня пастановы аб арганізацыі дасьледчаказальнай акругі выяжджаюць член калегіі РСІ БССР т. Ракаў, члены ўрадавай камісіі і рад інструктароў.

Няшчасны выпадак на пабудове ўнівэрсытэцкага гарадка

На пабудове ўнівэрсытэцкага гарадку бэтона-мяшалкай, якая сарвалася з рыштаваньня, забіты рабочы Васільлеў Іван. Вядзецца сьледзтва.

Перадача рабочых пасёлкаў Белжылсаюзу

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў перадаць Белжылсаюзу рабочыя пасёлкі пры заводах «Кастрычнік» і «Камінтэрн».

Камандыроўкі на рабфак

Культадзел ЦСПСБ разьмеркаваў паміж саюзамі 61 камандыроўку на рабфакі БДУ, 4 чалавекі камандыраваны на рабфакі РСФСР.

Вынікі абсьледваньня 13 інвалідпай арцелі

Менскае АКК РСІ паведамляе аб выніках абсьледваньня 13 інвалідпай арцелі па вырабе яўрэйскай кабасы. Па досланым допісе рэдакцыі газэты «Зьвязда» ўстаноўлена: з боку праўленьня арцелі адсутнічае ўсялякі кантроль за працай, у арцель прыняты былыя буйныя прыватнікі, фабрыканты і гандляры, якія ўлажылі свае сродкі і гэта мела ўплыў на сувязь арцелі з прыватнікамі; праўленьне ўцалку і старшыня праўленьня Шульман паасобку ня ўжылі свачасова папераджаючых мер, было хаатычнае вядзеньне бухгальтэрыі, грубае адміністраваньне загадчыка фабрыкі Додзіна. Праўленьню БСКО за нерэагаваньне на недарэчнасьці ў арцелі пастаўлена на від. Загадчыку фабрыкі Додзіну за грубае абыходжаньне з членамі арцелі абвешчана вымова. Старшыня праўленьня Шульман за безгаспадарчасьць зьняты з работы. Пытаньне аб несваячасовым рэагаваньні ячэйкі КП(б)Б БСКО і аб сыстэматычным п'янстве Пячонка — партыйца, аб якім пісалася ў заметцы, перадана на разгляд прэзыдыуму АКК. Увесь матар'ял аб безгаспадарчасьці пераданы ў пракуратуру.

Водпуск паступаючым у Камвузы

Наркампрацы распрацаваў палажэньне аб адпусках для асоб, якія паступаюць у камвузы. Паступаючыя ў Беларускі Камвуз, Акадэмію Камуністычнага Выхаваньня імя Крупскай атрымліваюць адзін месяц водпуску для падрыхтоўкі. Асобы, якія паступаюць ў Камвуз нацменшасьцяў Захаду імя Мархлеўскага—1 з пал. мес. Для паступаючых у Ленінградзкі Камуністычны унівэрсытэт, Маскоўскі Камвуз імя Сьвярдлова—устаноўлены 2-х месячны водпуск для падрыхтоўкі.

Матч Гомель-Масква

Футбольны матч Гомель-Масква ў Гомелі скончыўся перамогай маскоўскіх фізкультурнікаў в вынікамі 5—0 і 7—0. Масквічы паказалі гомельскім футбалістым, як трэба трэніравацца, каб перамагчы. Намачаецца арганізаваць футбольныя матчы з камандамі іншых буйных гарадоў.

СУД

Як былы карнілавец „пазычаў" грошы ў сялян

Ёсьць у Слуцкім раёне пасёлак Зарубеж. Жыве там Зубовіч Антак, які прайшоўшы, як аб ім гаворыць усё насельніцтва раёну, «агонь і воду». Каб ведаць, хто-ж такі Зубовіч, падамо яго «працоўны сьпіс».

... 32 гады, асьвета сярэдняя, беспартыйны, былы афіцэр—карнілавец, прысуджаны за растрату да ўмоўнага зьняволеньня на адзін год, за захаваньне стрэльбы аштрафаваны на 10 руб., быў пад сьледзтвам за рабункі, забойства і падпал, мае 13 дзесяцін зямлі, каня, карову, пляве дзядзіну, дае 800 рубл. прыбытку у год. Можна ўспомніць старое і загуляць у карты. Пачаў іграць, раз выйграе, два разы прайграе. Рашыў сыграць «во банк». Выцягнуў у жонкі з куфра увесь прыбытак—прайграў.

Каб адыграцца, стаў іграць супольна з падкулачнікам Дашкевічам. «Не вязе»: прайграўся і задаўжаўся Дашкевічу. Апошні патрабуе грошай. Пашоў Зубовіч пазычаць—адмаўляюць. Успомніў ён тады, што ад старых «добрых часоў афіцэрства» застаўся ў яго рэвальвэр, якім ён вельмі добра ўладае. Вось хто дапаможа мне здабыць грошы, падумаў Зубовіч.

Разам з Дашкевічам прышоў ён да селяніна Чэчата Івана. Сустрэлі яны яго на дварэ і загадалі ісьці ў хату.

— Стань каля стала і ня сходзь з месца да тэй пары, пакуль я не дазволю, загадаў Зубовіч Чэчату, наставіў на яго рэвальвэр і скамандаваў—«даеш грошы». Чэчат катэгарычна заявіў, што грошай няма. Тады [illegible] пагражаў падпалам. Дашкевіч дапамагаў яму запалохваць сляк.

Не дастаўшы грошай у Чэчата, Зубовіч і Дашкевіч пашлі на хутар Масткі да Гуткоўскага Паўлы, у якога заўсёды былі грошы, бо ён быў агент каапэрацыі па скупцы сьвіней. Гуткоўскі раней пазычаў грошы Зубовічу, але апошні іх не аддаваў. На гэты раз Зубовіч проста прыставіў наган да грудзей агента і каротка запытаўся: «пазычыш грошай?» Пад такой пагрозаю Гуткоўскі «пазычыў» 20 руб. Зубовіч узяў грошы і тутжа перадаў іх Дашкевічу.

Вось як былы храбры карнілаўскі афіцэр «пазычаў» грошы для гульні ў карты.

Гэтым не абмежавалася дзейнасьць карнілаўца. Ён спаліў гумно старшыні сельсавету Мізэра Івана.

Бабруйскі акруговы суд прыгаварыў Зубовіча да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй на пяць гадоў з пазбаўленьнем [illegible] пакараньня высяліць яго за межы БССР на тры гады.

Дашкевіч, па дапасаваньні да яго амністыі ЦВК БССР за 1 студзеня 1929 г., прыгавораны да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй на адзін год.

КЛЮБ імя К. МАРКСА

У чацьвер, 25 ліпеня, а 7 гадз. увеч. Культадзел ЦСПСБ сумесна з АК МОПР'у, СКЛІКАЕ

шырокую культ-нараду

з удзелам прадстаўніноў фабзаўмясцоммаў, камсамолу, жанаддзелу і ўсіх таварышоў, якія вылучаны ячэйкамі МОПР'у

ДЛЯ УДЗЕЛУ У МОПРАУСКІМ КАРНАВАЛЕ

—) ПАРАДАК ДНЯ: (—
1. Аб зьмесьце і плян карнавалу
2. Аб ачарыстоўваньні ўдзельнікаў карнавалу

Усе ячэйкі МОПР'у гор. Менску павінны вылучыць па 5 чал. ад кожнай ячэйкі для ўдзелу ў карнавале і прысылаць іх на нараду

КУЛЬТАДДЗЕЛ ЦСПСБ,
МЕНАКРУГКОМ МОПР'у.

Прафсаюзы дрэнна падрыхтаваліся да 2-тыднёвіку фізкультуры

Фізкультура в кожным годам усё шырэй ахапляе масы рабочых, работніц і рабочай моладзі. Узрастае лік гурткоў фізкультуры, паляпшаецца спортабсталяваньне, пашыраецца масавая фізкультработа, паступова ўводзіцца зарадкавая гімнастыка на прадпрыемствах. Але прафсаюзы зрабілі толькі першыя кроні на шляху ахвату фізкультурай рабочых мас.

Каб шырока ўцягнуць рабочых, работніц, рабочую моладзь у гурткі фізкультуры, прасунуць фізкультуру ў быт рабочага, палепшыць палітычнае выхаваньне фізкультурнікаў і праверыць усю фізкультурную работу прафарганізацый, з 27 ліпеня па 11 жніўня праводзіцца двухтыднёвік фізкультуры.

Двухтыднёвік павінен праходзіць пры актыўным удзеле рабочай класы і патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл культаддзелаў саюзаў.

Але на справе, мы бачым, што прафарганізацыі БССР не змаглі своечасова і як належыць правесьці патрэбную падрыхтоўку да двухтыднёвіка. ЦСПСБ яшчэ ў пачатку чэрвеня паслаў усім ЦП растлумачэньне і інструкцыі аб падрыхтоўцы да двухтыднёвіка. Аднак, да гэтага часу большасьць ЦП яшчэ нават не абгаварала гэтага пытаньня на пасяджэньнях прэзыдыўмаў саюзаў.

Прыкладам таго, што могуць зрабіць саюзы пры ўважлівых адносінах да падрыхтоўкі, сьведчыць работа саюзу гарбароў.

Саюз разаслаў ва ўсе аддзяленьні лісты аб шырокім растлумачэньні задач двухтыднёвіка, па ўсіх прадпрыемствах вылучаны тройкі, выпушчаны спэцыяльны нумар газэты, прысьвечаны двухтыднёвіку, выданы спэцыяльныя лістоўкі, якія распаўсюджваюцца на кватэрах рабочых, на двух фабрыках уведзена зарадкавая гімнастыка. У часе двухтыднёвіка саюз наладзіць шахматна-шашачны турнір на 200 дошак і г. д.

Трэба кароткі час, які яшчэ застаўся да пачатку двухтыднёвіка, максымальна выкарыстаць для таго, каб разгарнуць падрыхтоўку ў нізах, растлумачыць значэньне двухтыднёвіка шырокім масам. Увесь фізкультурны актыў павінен быць шырока ўцягнуты і окарыстаны ў часе двухтыднёвіка. Камсамольскія ячэйкі, якія да гэтага часу вельмі мала зрабілі для папулярызацыі двухтыднёвіка, павінны прыняць шырокі ўдзел у ім.

ЦП саюзаў павінны тэрмінова правесьці, як ідзе падрыхтоўка да двухтыднёвіка і дапамагчы выправіць дапушчаныя памылкі.

А.

Паведамленьні

Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што ў сераду 24 ліпеня а 7 гадзіне увеч. у памяшканьні райкому КП(б)Б склікаецца нарада сакратароў ячэек і апоргаў.

З прычыны важнасьці пытаньняў яўка абавязкова.

У чацьвер, 25 ліпеня, а 7 гадз. увеч., склікаецца нарада шэфтаварыстваў Фрунзаўскага раёну

Парадак дня:

1. Аб удзеле шэфаў у сьвяткаваньні Міжнароднага Чырвонага дня, 2. аб удзеле ў дні індустрыялізацыі, 3. інфармацыя шэфтаварыстваў аб удзеле ў чыстцы партыі і Савецкага апарату, 4. арганізацыйныя пытаньні.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні РК КП(б)Б.

Яўка ўсіх членаў Выканбюро, райшэфпраўленьня, рэвізійнай камісіі і секцый абавязкова.

Фрунзаўскае райшэфпраўленьне.

— САД ПРАЦАСЬВЕТЫ. Сёньня—кіно-фільм—„За манастырскай сьцяной".

Пачатак а 10 г. ув.

— Сёньня, у садзе друкароў, а 8 г. ув. аб'яднанымі ячэйкамі Мопру і Дзаржрукарні, друкарні газ. „Зьвязда" і БДВ наладжваецца масавы сход рабочых і служачых, прысьвечаны міжнароднаму чырвонаму дню.

Пасьля дакладу—кіно.

Уваход па разданых білетах.

— Сёньня, а 6 г. ув., у памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў ячэек і партыйцаў, старшынь фабкомаў, заўкомаў і мясцкомаў.

Яўка на нараду паказаных таварышоў абавязкова.

— Сёньня, а 7 г. ув., у клюбе К. Маркса, адбудзецца агульна-гарадзкі сход работніц, жонак рабочых і актыву, прысьвечаны чырвонаму дню 1 жніўня.

Дэлегаткі і дэпутаты гарсавету ўваходзяць па сваіх мандатах, астатнія па білетах, разданых па ячэйках.

— Сёньня, а 7 г. ув., у клюбе К. Маркса, адбудзецца агульна-гарадзкі сход работніц, жонак рабочых і актыву, прысьвечаны чырвонаму дню 1 жніўня.

Дэлегаткі і дэпутаты гарсавету ўваходзяць па сваіх мандатах, астатнія па білетах, разданых па ячэйках.

— Сёньня, а 7 г. ув., у памяшканьні акруговага суду адбудзецца чыстка апарату Наркамюсту і Вархоўнага суду.

Запрашаюцца рабочая брыгада па агляду працы НКЮ і ўсе працоўныя.

Камісія.

Ліст у рэдакцыю

У газэце «Зьвязда» № 163 за 20 ліпеня 1929 г. у заметцы «Як пляную зямлянку» зроблена заўвага аб тым, што быццам я ня ведаючы, што рабіць з даручаным мне заданьнем, падшыла яго да справы. Заўвага не адпавядае сапраўднасьці, бо гэта папера знаходзілася ў ліку тых папер, якія чакалі выкананьня і ніколі я да справы не падшывала, аб чым заявіла на агульным сходзе камісіі па чыстцы апарату НКЗ.

Тэхнічны сакратар зямляну Баркоўская

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

26 ліпеня, а 6 гадз. увечары ў клюбе ЦП саюзу гарбароў (рог Рэвалюцыйнай і Камсамольскай № 7-11) АДБУДЗЕЦЦА

пасяджэньне Бюро Скаргаў НКРСІ

па пытаньні правядзеньня ў жыцьцё пастановы Калегіі НКРСІ Установамі па прыёме і абслугоўваньні наведвальнікаў.

На пасяджэньне выклікаюцца кіраўнікі ўстаноў, старшыні мясцкомаў і эканомкамісій, у якіх зроблена праверка.

Запрашаюцца прадстаўнікі ЦП саюзу і супрацаўнікі—члены саюзу.

КІНО-ТЭАТР „Культура"
ШУКАНЬНЕ ДОЛІ ПАІ
Мастацкі фільм
Звыш праграмы гастролі ўсходняга ансамбля, сусьветнага атракцыёну
Пачатак сэансу роўна а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71.
ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ
Вялікі мастацкі гістарычны фільм
гістарычная кіно-драма ў 10 частках.
2 сэансы: пач. 1 г. а 9 г. 15 м., 2—10 г. 45 м.

КІНО Інтэрнацыянал
Трагэдыя акрабата
Мастацкі фільм з цыклю вядомае карціны „Чатыры Чорта"
драма з жыцьця цырку ў 8-мі частках.
Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 5 гадз. 30 м.

КІНО Пралетары
НЕСПАДЗЯВАНЫ ГЭРОЙ
Новы мастацкі фільм
Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.

КІНО СпартаК
Звыш праграмы гастролі артыста Ленінградз. тэатраў Б. А. Валенцінава
У праграме сатыра, юмар, частушкі і інш.
На экране сусьв. фільм „МАТЬ" М. ГОРКАГА др. у 7 част.
Пачатак а 7 г. 30 м. Каса адчынена ад 6 г.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА
Сэрада, 24 ліпеня „СИЛЬВА" музкамэдыя ў 3-х дзеях, Кальмана.
Чацьвер, 25 ліпеня „НОЧЬ ЛЮБВИ" муз. мазаіка ў 3-х дзеях, Валенціна
Білеты на абвешчаныя спэктаклі прадаюцца ў касе Дзяржтэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе з 12—2 і ад 4—6 гадз. увеч.
Дырэкцыя.

Гидротехникам, культуртехникам, землемерам и агрономам
В ближайшие дни ПОСТУПИТ В ПРОДАЖУ
Тарасов Г. И., инженер
Материалы к уточнению проектирования осушительных систем
СОДЕРЖАНИЕ: 1. О модуле стока. 2. О расстоянии между канавами. 3. О регулировании заболоченных рек.
ЦЕНА 1 руб. 75 коп.
ЗАКАЗЫ НАПРАВЛЯТЬ: Западная областная опытно-мелиоративная станция, г. Смоленск, Социалистическая, 4.

СКОРА СКОРА
ДА ЗАЎТРА

ЮЖХИМТРЕСТ
ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ
ХИМСИНДИКАТ

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ
на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы
НА ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, яе упоўнаважанымі, адз. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", адз. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
З мэтай эканоміі газэтнай паперы, камплекты газэты „Зьвязда" будуць друкавацца за першыя чысла кожнага месяцу ў самай абмежаванай колькасьці.
Таму гал. кантора газ. „Зьвязда" просіць усіх падпісчыкаў здаваць падпіску да 28-га чысла. Па заказах, якія паступяць у гал. кантору несвачасова, к-ра не гарантуе высылкі газэты камплектам за першыя чысла, а толькі са дня паступленьня заказу.
Каб забясьпечыць атрыманьне першых нумароў «Зьвязды» за жнівень, просьба падпісацца загадзя, не позьней 27—29 ліпеня.

ЛЮБУЮ КНИГУ
в 3-дневный срок выслыл. наложен. платож. Заказы и деньги адр. Москва, Центр. Политехнический Музей, 110-20. Коп. Т-во „КУЛЬТУРА и ЗНАНИЕ".

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званеце па тэл. 7-81

ПРАДАЮЦЦА БОЧКІ з жалезнымі абручамі ад друкарскай фарбы.
БАЛЁНЫ у плеценых кашох з-пад салянай кіслаты.
Зварочвацца да заг. гаспад. друк. «Зьвязды» (Савецкая, 63) ад 3—5 гадз. дня.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
КНІГА ПОШТАЙ
Кніга-Поштай выконвае заказы на ЛЮБУЮ КНІЖКУ беларускую, польскую, яўрэйскую, літоўскую і латыскую.
Заказы да 1 рубля выконваюцца па атрыманьні ўсяго кошту заказу. Звыш 1 рубля—па атрыманьні задатку ў разьмеры ня менш 25%
Школам і установам скідка 10% ПЕРАСЫЛКА—пры высылцы наперад усяго кошту заказу—ДАРМОВА
Заказы выконваюцца ў той-жа дзень, калі атрымляецца заказ. КАТАЛЕГ высылаецца ДАРМОВА
Заказы і перапіску пасылайце па адрасе: Менск, Кніга-Поштай БДВ.

АБВЕСТКА
Менская акруговая кантора сувязі даводзіць да ведама дзяржаўных устаноў, каапэрацыйных і ганднёвых арганізацый і прыватных асоб г. Менску, што пры канторы адкрываецца
ПАКАВАЛЬНЫ ПУНКТ для запакаваньня пасылак і бандэроляй
ЗА НАСТУПНУЮ ЦАНУ:
За ўпакоўку, абшыўку і перавязку пасылак у мяккую абкладку, альбо скрынку з фанэры ці кардону вагаю да 5 кілгр.—50 к., да 10 кілгр.—75 к., да 16 кілгр.—1 р. 25 к., да 20 кілгр.—1 р. 50 к., да 35 кілгр.—1 р. 75 к., а за абшыўку скрынкі палатном або рагожаю на 50 к. дарожэй.
За ўпакоўку бандэроляй у паперу—10 кап.
АДМІНІСТРАЦЫЯ КАНТОРЫ СУВЯЗІ

АД ВАЛЮТНАГА КІРАЎНІЦТВА НАРКАМФІНУ БССР
---) Трэці тыраж (—
2-й дзяржаўнай унутранай пазыкі індустрыялізацыі
адбудзецца 26, 27 і 28 ліпеня, 1929 г. у гор. Харкаве.
У гэтым тыражы бяруць удзел усе облігацыі процентна-выйгрышнага і бяспроцентна-выйгрышнага выпускаў пазыкі, за выключэньнем тых, што выйгралі ў 1 і 2-гім тыражох.
Усяго па абодвых выпусках пазыкі будзе разыграна 108.600 выйгрышаў на суму 11.677.200 рублёў, у тым ліку

а) ПА ПРОЦАНТНА-ВЫЙГРЫШНЫМ ВЫПУСКУ			б) ПА БЯСПРОЦ.-ВЫЙГРЫШНЫМ ВЫПУСКУ		
4	выйгрышы	па 5.000 р.	14	выйгрышаў	па 5.000 р.
80	»	» 1.000 р.	280	»	» 1.000 р.
600	»	» 250 р.	2100	»	» 250 р.
22516	»	» 100 р.	83006	»	» 100 р.
Усяго 23 тысячы 200 выйгрышаў на суму 2.501.600 р.			Усяго 85.400 выйгрышаў на суму 9.175.600 р.		

Па кожным выпуску пазыкі тыраж будзе праводзіцца самастойна. Облігацыя, якая выйграе, пагашаецца і не бярэ ўдзелу ў далейшых розыгрышах. Трымаецю облігацыі, апрача выйгрышу, выплачваецца сапраўдны кошт, а па облігацыі процантна-выйгрышнага выпуску, якая выйграла,—таксама выплачваюцца і процанты, што нарасьлі па купону да дню сканчэньня тыражу.
Выйгрышы выплачваюцца ўстаноўленым для гэтай пазыкі парадкам установамі Дзяржаўнага Банку ды іншых банкаў, дзяржаўнымі прапоўнымі к асамі ашчаднасьці, паштова-тэлеграфнымі ўстановамі, сельска-гаспадарчымі крэдытнымі таварыствамі і фінансава-падатковымі часткамі раённых і валасных выканкомаў пасьля атрыманьня ва мясцох 3-х чарговых нумароў газэт «Известия ЦИК СССР і ВЦИК».
Начальнік Валютнага Кіраўніцтва НКФ БССР Танхілеўсі.
Інспектар па дзяржаўных пазыках Рабцевіч.

ЗА ОДНУ КОПЕЙКУ!!!
ЕДИНСТВЕННОЕ В СССР МАССОВОЕ ИЗДАНИЕ ПО РАДИОТЕХНИКЕ.
На-днях выходят в свет первые 8 выпусков.
ВСЕСОЮЗНОЕ ОБЩЕСТВО ДРУЗЕЙ РАДИО
РАДИОБИБЛИОТЕКА „КОПЕЙКА"
№ 1 РАДИОПРИЕМНИК ИЗ ЖЕЛЕЗА
Первая серия—100 выпуск.
Цена выпуска—1 коп.
Каждый выпуск—совершенно самостоятельная и вполне законченная тема — описание радиоприемных, радиопередающих аппаратов и радиодеталей.
Продажа РАДИОБИБЛИОТЕКИ „КОПЕЙКА" во всех книжных магазинах, киосках, на станциях жел. дор., на пристанях и у всех газетчиков.
ГЛАВНЫЙ (ОПТОВЫЙ) СКЛАД ИЗДАНИЯ: Москва, 9, Тверская, 17, Изд-ство НКПТ.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

ПАПРАЎКІ
да абвесткі НК Асьветы («Зьвязда» № 161):
1. Замест Менскага Хэмічнага Тэхнікуму адчыняецца хэмічнае аддзяленьне пры Менскім Палітэхнікуме.
Тэрміны прыёму заяў і іспыты на гэтае аддзяленьне—тыя-ж, што вызначаны для Палітэхнікуму.
2) Прафшколы хэмікаў: у Менску на яўрэйскай мове, у Гомелі на беларускай мове.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ —— У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У ——
кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Член. кн. саюзу дрэваапрацоўшчыкаў Рушко. 2108
Дапрызыўная кніжка Рушко Г. Ф., выд. Бабруйскім ваенкаматам. 2109
Паявая кніжка № 300 Гаўрылавец К. Я., выд. Мілашэвіцкім спажывецкім таварыствам. 2110
Вуч.-вайск. картка Розенблюма Ю. Ф., выд. Астраш.-Гарадзкім РВК. 2111
Чл. біл. саюзу будаўнікоў Розенблюма Ю. Ф. 2112
Пашпарт Герасьменя В., выд. Старобінскім РВК. 2113
Пашпарт Фрыд Х.-З. Ш., выд. Менскай міліцыяй. 2114